ЭКСКЛЮЗІЎНА? ІНКЛЮЗІЎНА! 7

КАМУ ВАКЦЫНАВАЦЦА Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

20 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. СЕРАДА № 202 (29571)

КАРОТКА

- **ВУП Беларусі ў студзені — верасні вырас на 2,7 працэнта — згодна з першай ацэнкай аб'ём ВУП у бягучых цэнах склаў Br126 млрд.**
- Органы фінрасследаванняў з пачатку года распачалі 30 крымінальных спраў за выплаты зарплаты ў канвертах.
- **Курсанты Ваеннай акадэміі Беларусі ўдзельнічаюць у вучэнні АДКБ «Пошук-2021» у Таджыкістане.**
- Аб'ём інвестыцый рэзідэнтаў «Вялікага каменя» ў І паўгоддзі склаў больш за $30 млн.

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый ЧАРАДНІЧЭНКА, намеснік міністра аховы здароўя:

«Цячэнне COVID-19 сёння некалькі змянілася. Галоўная асаблівасць у тым, што хвароба хутка прагрэсуе, становіцца яшчэ больш каварнай, і ў першую чаргу з-за цяжару клінікі. Пацыенты паступаюць цяжкія, у асноўным усе яны кіслародазалежныя. Падача кісларoду не спыняецца ні на хвіліну, спецыялісты дзяжураць на кожным аб'екце кругласутачна. Зараз, калі ў краіне ідзе досыць сур'ёзная хваля COVID-19, на аказанне дапамогі пацыентам з каранавірусной інфекцыяй накіраваны ўсе сілы не толькі медыкаў, але і спецыялістаў іншых сфер — заводаў і прадпрыемстваў па вытворчасці высокатэхналагічнай тэхнікі, інжынераў прадпрыемстваў па вытворчасці кісларoду. Цяперашні дэльта-штам прыводзіць да росту патрэбнасці ў медыцынскім кіслародзе. Па падліках медыкаў, у суткі ў сярэднім на аднаго пацыента прыходзіцца 10—15 тысяч літраў».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ПРЫМАЛЬНЫЯ ЛЮБЫЯ МЕТАДЫ, АКРАМЯ ПРЫМУШЭННЯ ЛЮДЗЕЙ»

Эпідэміялагічную сітуацыю і меры супрацьдзеяння каранавіруснай інфекцыі абмеркавалі на нарадзе ў Прэзідэнта

У Палацы Незалежнасці ўчора сабраліся прадстаўнікі ўрада і эксперты-медыкі. З рэгіянальных студый па відэасувязі да сустрэчы далучыліся старшыні аблвыканкамаў. Гэты тыдзень у графіку кіраўніка краіны прысвечаны праблематыцы лячэння людзей ад кавіду — пачаўся нарадай у Палацы Незалежнасці, а працягнецца размовамі з пацыентамі ў палаце. Сустрэча ў аўторак была досыць маштабная — і па колькасці ўдзельнікаў, і па важнасці тэм, што ўзнімаліся. Пра даручэнні і выказванні, зробленныя на нарадзе, — у гэтым матэрыяле.

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка на пачатку сустрэчы запытаўся ў міністра аховы здароўя Дзмітрыя Піневіча, ці былі на каранціне перад нарадай з Прэзідэнтам прысутныя, ці рабілі яны ПЛР-тэсты?

Пытанне, відавочна, паставіла міністра ў тупік: «Не...»

«Як гэта так? Вы прыйшлі да кіраўніка краіны, да Прэзідэнта, і не праверылі тых, хто тут прысутнічае! Што гэта за стаўленне да таго, у чым вы мяне пастаянна пераконваеце? — быццам бы абурыўся Прэзідэнт, але тут жа працягнуў: — Але вы правільна зрабілі. У нас гэта не прынята, нягледзячы на тое, што ва ўсім свеце да Прэзідэнта людзі не прыходзяць без каранціну. Я спецыяльна задаў гэта пытанне, каб задаць наступнае. Калі вы да Прэзідэнта заходзіце, адчыніўшы дзверы нагой, дык навошта вы здзекуецеся з людзей?»

Кіраўнік краіны адзначыў, што да яго на прыём чыноўнікі на працягу ўсёй пандэміі прыходзілі без масак, ПЛР-тэстаў, праверкі сертыфікатаў аб вакцынацыі, і зноў задаў пытанне: навошта тады насельніцтва прымушаюць да гэтага?

«Чаму паднялі лямант на ўсю краіну? Чаму міліцыю мабілізавалі на праверкі масачнага рэжыму. Вам што, няма чым займацца? Вы чаму закон парушаеце? У нас няма закона, які дае права абмацваць, даглядаць, лавіць людзей», — абурыўся Прэзідэнт.

Ён згадаў Брэсцкую вобласць, дзе, па яго словах, ужо штрафаваць пачалі за адсутнасць масак і прымушаюць вакцынавацца насуперак просьбам кіраўніка дзяржавы не дапускаць гэтага. На яго думку, вакцынаванне і выкарыстанне маскі — права кожнага чалавека.

«Я нікога не прымушаю. Гэта ваша права. Калі чалавек хворы, Піневіч, напрыклад, «заказвідзіў», ён ніколі да Прэзідэнта не пойдзе. Так павінен паступаць кожны жыхар нашай краіны. Тым больш што мы не ўсё ведаем аб гэтай хваробе. ***І кожны чалавек павінен распараджацца сваім лёсам, як ён лічыць неабходным»***, — сказаў Прэзідэнт. СТАР. 2

Наш чалавек

ТЫСЯЧА І АДНА ДОБРАЯ СПРАВА

Як прадпрымальнік са Слуцкага раёна захоўвае памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ўвекавечвае подзвіг сучаснікаў

Уладзіміра БОЙКУ на Случчыне, а таксама ў суседнім Старадарожскім раёне перш-наперш ведаюць па яго справах. Менавіта пра такіх людзей кажуць — дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся. У гэтым карэспандэнты «Звязды» пераканаліся, калі асабіста пазнаёміліся з прадпрымальнікам і краязнаўцам. І тут лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Што, дарэчы, мы і зрабілі. СТАР. 9

Фота Яўгена ПРАСЕЦКАГА.

Дзякуючы Уладзіміру БОЙКУ помнік 121-й стралковай дывізіі быў адкрыты ў дзень 80-годдзя яе першага бою на старадарожскай зямлі.

Актуальнае інтэрв'ю

ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ — НАЙВАЖНЕЙШЫ НАПРАМАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ

Сельскагаспадарчы сезон падыходзіць да фінішу. У краіне завяршаецца ўборачная кампанія, скончана сяўба азімых культур. Хутка працаўнікі вёскі адзначаць сваё прафесійнае свята — Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці АПК. З якімі вынікамі хлебаробы Беларусі сёлета будуць адзначаць святочную дату, і многае іншае — карэспандэнту «Звязды» расказаў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь Іван КРУПКО.

— Іван Іванавіч, наколькі паспяховым быў гэты год для работнікоў сельгаспрадпрыемстваў краіны, ці задаволены сёлетнім ураджаем?

— Сельскагаспадарчая галіна і асабліва раслінаводства — гэта вытворчы цэх пад адкрытым небам, і кліматычныя змены ўплываюць у рознай ступені на канчатковыя вынікі. 2020 год быў больш спрыяльны, і паказчыкі вытворчасці асноўных сельскагаспадарчых культур склаліся высокія, а па нарыхтоўцы травяных кармоў — рэкордныя, дазволіўшы забяспечыць іх паўтарагадовы запас.

Разам з тым, 2021-ы больш экстрэмальны па кліматычных умовах, што не дазваляе аграрыям дасягнуць леташніх паказчыкаў па шэрагу культур. Пры гэтым, калі ацэньваць бягучы год з сярэднімі за мінулую пяцігодку, то па большасці паказчыкаў сёлетнія прагнозы вышэйшыя за сярэднія за пяцігодку. СТАР. 4

«ПРЫМАЛЬНЫЯ ЛЮБЫЯ МЕТАДЫ, АКРАМЯ ПРЫМУШЭННЯ ЛЮДЗЕЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён яшчэ раз падкрэсліў, што прадстаўнікі ўлад не маюць заканадаўчага права штрафаваць насельніцтва за адсутнасць масак у грамадскіх месцах.

Ад «уханьскага» да «індыйскага»

Прэзідэнт сцвярджае: неабходна медыкам вяртацца да той стратэгіі барацьбы з ковідам, што практыкавалі падчас першай хвалі. Як ён заяўляе, насуперак надзеям шматмільярднага насельніцтва Зямлі і прагнозам сусветнай навукі каранавірус са сваімі мутацыямі і новымі штамамі застаецца рэальнай пагрозай для ўсіх краін.

«Вірус не дурань. Ён навучыўся штамы праходзіць, пераадольваць. Мы перажылі «паўднёва-афрыканскі», потым «брытанскі», сёння «індыйскі» («дэльта») штамы», — кажа Прэзідэнт.

Ён запытаўся, чаму прышчапляюцца вакцынай, створанай яшчэ ад «уханьскага» штаму каранавіруса. «Я не зусім разумею. Спецыялісты кажуць, што да віруса, які муціруе, неабходна прыстасоўваць і вакцыну. Наколькі эфектыўная вакцына «ўханьскага» перыяду да «індыйскага» штаму віруса. Вось гэта вельмі важна. Але тое, што гэты ковід на крок напераднее нашай навукі і, магчыма, і практыкі, вы прызнаяце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, распрацоўкі вучоных даганяюць барацьбу з вірусам, але практычная медыцына ўсё ж больш прасунулася ў супрацьдзеянні інфекцыі.

«Набрацца цярпення і лячыць людзей»

Прэзідэнт заўважае, што да прыходу чацвёртай хвалі рыхтаваліся. Гэта пытанне было заўсёды на яго кантролі. Нават калі пра гэта не паведамлялася ў СМІ.

«Мне прэс-сакратар далажыла, што яны з кіраўніком маёй Адміністрацыі праманіторылі інтэрнэт. Людзі там шалеюць, абураюцца, патрабуюць, пытаюцца: «Дзе Прэзідэнт?» Слухайце, я кожны дзень у тэлевізары даю справаздачу перад людзьмі, чым я займаюся. Я ж не магу кожны дзень з раніцы да вечара займацца лячэннем людзей. Для гэтага ў мяне ёсць міністэрства і тысячы людзей у белых халатах», — падкрэсліў Прэзідэнт і дадаў, што пад яго ўвагай застаюцца і пытанні аграрнага парадку, і пераадоленне санкцыйных праблем.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што нават пасля ўвядзення «драконаўскіх» мер уладамі іншых краін сітуацыя з ковідам не палепшылася. «Ніякія маскі, ніякая нават вакцынацыя (але я не супраць яе) нас не выратуюць. ***Нам неабходна набрацца цярпення і лячыць людзей. Калі мы будзем эфектыўна працаваць, на працягу месяца прыйдзем да мінімуму. А калі зоймемся палітыкай ковіднай і антыковіднай, давядзём народ да бунтаў, як у Еўропе»***, — выказваецца кіраўнік краіны.

Фота БелТА.

У рэжыме відэасувязі былі ўсе рэгіёны.

Прэзідэнт мяркуе, што замест прымусу насельніцтва неабходна перакананаць і прастымуляваць кожнага да прышчэпкі. «Мне дакладваюць: на адным з заводаў у Мінску людзям даплацілі па 100 рублёў, і 99 % прыйшлі і вакцынаваліся. Я, канечне, супраць таго, каб людзі куплялі сваё здароўе за грошы. Але гэта права людзей і іх кіраўніка. То-бок розныя ёсць варыянты», — канстатуе Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ адна праблема, якая была ў фокусе ўвагі на нарадзе, — каранафэйкі.

«Інтэрнэт стаў палітычным полем бойкі. Калі вы там жывяце, парадку не будзе. Ім неабходна ўскалыхнуць краіну. Усе яны сядзяць за мяжой і пачынаюць лямантаваць», — паведаміў кіраўнік краіны.

Слова пасля Прэзідэнта ўзяў міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч. Ён расказаў: штодня праходзяць кансультацыі з рэгіёнамі Мінаховы здароўя, працуе адпаведная група ў Савеце Міністраў, штабы ў рэгіёнах.

«Сітуацыя поўнасцю кантралюецца. Праводзіцца ўвесь комплекс мерапрыемстваў, які накіраваны на прафілактыку, на перарыванне эпідэміялагічнага працэсу і на лячэнне пацыентаў», — сказаў кіраўнік ведамства.

«Падзяляю гэты асцярожны аптымізм»

Пасля заканчэння нарады Прэзідэнт падсумаваў выступленні спікераў і адзначыў: ён падзяляе насцярожаны аптымізм спецыялістаў. «У мяне склалася меркаванне, што катастрофы няма. Я хутчэй за ўсё падзяляю гэты асцярожны аптымізм, выказаны з месцаў, што мы не дадаём тэмпамі, як былі два тыдні — месяц таму. Дзесьці на 3-4 працэнты людзей захварэлых у нас менш становіцца», — сказаў кіраўнік краіны.

Тэндэнцыя гэтай хвалі каранавіруса — вялікая колькасць маладых пацыентаў. Як заўважыў Прэзідэнт, яны пераносяць хваробу хутка, з невялікай колькасцю цяжкіх выпадкаў. Таму асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на прадухіленне захваральнасці старых.

«Не дай бог, перакінецца гэта зараза на старых — мы страцім велізарную колькасць насельніцтва», — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

Як яму далажыў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка, сярод 21 тысячы насельнікаў разнастайных інтэрнатаў толькі 10 чалавек хварэюць. Дабіцца такіх паказчыкаў дапамагла вакцынацыя насельнікаў і персаналу сацыяльных устаноў.

Прэзідэнт заўважыў, што, паводле вывучэння грамадскай думкі, беларусы падзяліліся ў сваіх поглядах на прафілактыку распаўсюджвання інфекцыі. Хтосьці выказваецца адназначна за нашэнне масак, вакцынацыю, іншыя — супраць.

«Прымальныя любыя метады, акрамя прымушэння людзей. Папярэджваю ўсіх: міліцыю, санслужбы — гэта жорсткае парушэнне закона. У нас няма заканадаўчых падстаў, Прэзідэнт не прымаў адпаведныя рашэнні, каб нахіляць людзей і прымушаць. Але прасіць іх трэба», — заявіў кіраўнік краіны наконт мер прафілактыкі.

Пры гэтым ён адзначыў: усё ж было б нядрэнна насіць маску ў гандлёвых пунктах, транспарце, але сродкі аховы на вуліцы не даюць ніякага эфекту.

Прэзідэнт заклікае беларусаў да вакцынацыі. Так, ён адзначае, што прышчэпка — не панацэя ад хваробы. Але смяротнасць сярод вакцынаваных нулявая, а колькасць цяжкіх пацыентаў — да 1 працэнта. «Нам трэба пражыць восеньска-зімні перыяд, да наступнага лета. Вакцына тут добра дапаможа. Далей жыццё пакажа, як дзейнічаць і што рабіць», — кажа Прэзідэнт.

Выказаўся ён і наконт масавых мерапрыемстваў у пандэмію. Асноўны пасыл такі: абыходзіцца без іх там, дзе магчыма.

А вось што застанецца ў грамадстве назаўсёды, як і ковід, на думку Прэзідэнта, гэта «балбатня» ў інтэрнэце. На яе ён раіць менш звяртаць увагі.

«Гэта ж не нашы людзі знутры тут крычаць, а з-за мяжы. Чаму крычаць? Грошы трэба адпрацаваць, грошы ўзялі вялікія. То-бок, яны такім чынам зарабляюць грошы: можа, атрымаецца яшчэ адзін раз падняць мяцеж у Беларусі. Іх галоўная задача — выштурхнуць людзей на вуліцу, усхваляваць, каб яны выступілі супраць улады», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт забараніў абмяжоўваць і адмяняць планавую дапамогу пацыентам у гэтыя часы, паставіў задачу наладзіць пастаўкі з Індыі ў запас неабходных лекавых сродкаў для лячэння ковіду. Ведае ён і пра сітуацыю з ШВЛ-апаратамі.

«Мы не можам у кожную раённую бальніцу паставіць 13 апаратаў ШВЛ, бо яны непатрэбныя будуць, калі сыдзе ковід. Я казаў, што гэта нятанна, ды і набыць іх зараз вельмі складана. Штук 15 мы атрымаем да канца года. Але пытанне не ў гэтым. Калі ў адным раёне загружаны апараты ШВЛ на сто працэнтаў, а ў суседнім з дзесяці толькі два, дык чаму туды за 40 кіламетраў на хуткай дапамозе не перакінуць чалавека?» — адзначае кіраўнік краіны.

«Прафілактыка нашых хвароб — гэта здаровы лад жыцця»

Пад асаблівы кантроль узятае Аляксандрам Лукашэнкам пытанне ператрымкі пацыентаў у бальніцах. Прэзідэнт сцвярджае: па 7—10 дзён нельга трымаць там людзей, што не маюць патрэбу ў доўгай шпіталізацыі.

«Не ператрымлівайце людзей у бальніцах. Так, у нас толькі палова ложкаў задзейнічана пад ковід. Але нельга забываць, што людзі хварэюць і на іншае. Іх жа трэба таксама лячыць, нельга адкладаць на потым. Потым чалавек можа і недачакацца», — канстатуе Аляксандр Лукашэнка.

Галоўная задача ўсіх мер, як сцвярджае кіраўнік краіны, — захаваць у гэтыя часы звычайны рытм жыцця чалавека.

«Трэба пражыць гэтую зіму. І больш гуляйце на вуліцы, неабходна прымусіць лёгкія працаваць. Калі і захварэеш, лягчэй будзе перанесці. Гэта ўжо з майго вопыту. І ніякіх масак на вуліцы. ***Прафілактыка нашых хвароб — гэта здаровы лад жыцця»***, — падкрэслівае Аляксандр Лукашэнка.

Ён рэзюмуе: утрымаць эканоміку ў пандэмію дапамагло рашэнне не ўводзіць лакдаўн у мінулыя хвалі ковіду.

«Мы маем магчымасць прапанаваць людзям тавар. Гэта нас выратавала. А то б мы хадзілі па ўсім свеце з працягнутай рукой і прасілі гэтыя капейкі. Пакуль мы спраўляемся самі. І, я думаю, мы справімся, калі ўсе мабілізуемся», — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Напрыканцы ён анансаваў: з наступнага дня пачынае працаваць у праблемных бальніцах. Будзе сачыць, як на месцах спраўляюцца з хваробай.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя, адзначыў, што краіна ідзе па тактыцы паскоранай вакцынацыі насельніцтва на добраахвотнай аснове. Як ён паведаміў, амаль 27 % насельніцтва вакцынавана першым кампанентам, у абароце ёсць зараз 800 тысяч вакцын, паступленні чакаюцца на гэтым тыдні. У планах медыкаў — да канца года прыйсці да пяці мільёнаў прышчэпленых.

«Адна з асаблівасцяў дадзенай хвалі ковіду — захваральнасць дзіцячага насельніцтва, падлеткаў, маладых людзей і цячэнне гэтага інфекцыйнага захворвання ў цяжарных», — адзначыў кіраўнік ведамства.

Па яго словах, больш актыўна хварэюць мінчане, жыхары Гомельскай і Мінскай абласцей, найменш напружаная эпідэміялагічная сітуацыя зараз у Гродне.

Міністр сказаў журналістам, што пасля нарады будзе перагледжана аказанне спецыялізаванай меддапамогі, у тым ліку планавай. «Мы падкарэкціруем нашы дакументы і лагістыку, каб тыя, хто маюць патрэбу ў любым відзе дапамогі, не атрымалі адмову», — акцэнтаваў Дзмітрый Піневіч.

Прэзідэнт нагадаў, што ковід — дарагая хвароба, якая напружвае эканоміку ўсёй краіны. З канкрэтнымі фактамі на тэму выступіў прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка. «Фінансаванне аховы здароўя ідзе планава. За 9 месяцаў сёлета расходавана каля 6 мільярдаў рублёў, 98 % ад плана 9 месяцаў і 77 % ад плана года. Урадам выкарыстоўваюцца ўсе даступныя фінансавыя інструменты для забеспячэння ўстойлівага функцыянавання галіны. Але пандэмія вымушае нас шукаць новыя крыніцы для фінансавання. Таму ў найбліжэйшы час мы звернемся да кіраўніка краіны аб выдзяленні дадатковых сродкаў у памеры амаль 250 мільёнаў рублёў», — сказаў Раман Галоўчанка.

Яшчэ такую ж суму, па словах прэм'-ера, прыдзецца шукаць у мясцовых і рэспубліканскім бюджэтах для ковідных даплат у сістэме аховы здароўя ў чацвёртым квартале. За гэты год дадаткова медыкам, што працуюць з ковід-хворымі, накіраваны сродкі ў памеры 825 мільёнаў рублёў, а з пачатку пандэміі — 1 мільярд 300 мільёнаў.

Як паведаміў прэм'ер, прынятыя рашэнні па забеспячэнні сістэмы аховы здароўя айчыннымі сродкамі індывідуальнай аховы даюць плён. Амаль закрытыя ўнутраныя патрэбы ў гэтых рэчах. На завяршальнай стадыі — стварэнне ўласнай вытворчасці латэксных пальчатак.

ЯК ПАТРАБУЮЦЬ ІНТАРЭСЫ ДЗЯРЖАВЫ

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА прадставіў новага міністра юстыцыі Сяргея ХАМЕНКУ калектыву.

Фота БелТА.

«Назначаючы Сяргея Мікалаевіча, Прэзідэнт растлумачыў сваё рашэнне назначыць менавіта чалавека з сілавой структуры», — сказаў Ігар Сергеенка. Паводле яго слоў, калектыў Міністэрства юстыцыі стабільна працуе, выконвае ўсе пастаўленыя задачы. «Своеасаблівым экзаменам на прафесійную і палітычную сталасць стаў мінулы год. Працуючы ў Адміністрацыі Прэзідэнта разам з Міністэрствам юстыцыі, не ўзнікала якіх-небудзь сур'ёзных праблем, звязаных з нядбайнасцю, некваліфікаваным падыходам да разгляду тых ці іншых пытанняў. У найбліжэйшы час міністр бліжэй пазнаёміцца з калектывам, унікне ў сутнасць. Вопыт кіруючай работы дапаможа яму справіцца з ускладзенымі абавязацельствамі», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Сергеенка падкрэсліў, што не стаіць задача зрабіць з калектыву Мінюста ваенных людзей. «Прэзідэнт, даючы наказ Сяргею Мікалаевічу, сказаў, што калектыў, у які ён ідзе працаваць, не воінскае падраздзяленне, не органы МУС, але тым не менш дысцыпліна, парадак павінны быць забяспечаны. Думаю, што з вашай дапамогай і пры непасрэдным удзеле ўсе пытанні будуць вырашацца так, як патрабуюць інтарэсы дзяржавы, і вы апраўдаеце аказаны давер», — канстатаваў ён.

У сваю чаргу, міністр юстыцыі Сяргей Хаменка дадаў, што ён узначаліў калектыў, які карыстаецца вялікай павагай не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. «Тыя людзі, якія тэлефанавалі з Расіі, Казахстана, Грузіі, віншуючы, у першую чаргу гаварылі аб высокім прафесіяналізме беларускіх юрыстаў. Ніколі не думаў, што буду ўдастоены такога высокага гонару ўзначаліць гэта міністэрства — прафесіяналаў, найлепшых юрыстаў на сённяшні дзень, — сказаў ён. — Асноўнымі прынцыпамі ў маёй дзейнасці, пачынаючы з лейтэнанцкіх пагонаў, заўсёды былі дзве пазіцыі — прыстойнасць і стараннасць. Прыстойнасць — калі ўласныя інтарэсы ніколі не перавышаюць інтарэсаў грамадства, асобы і дзяржавы. А стараннасць — калі табе пастаўлена задача, якую ніхто не можа выканаць, а ты выконваеш яе ў названыя кіраўніцтвам тэрміны і з высокай якасцю».

Паводле БелТА.

ПРА «ДАХОДЫ Ў КАНВЕРТАХ»

Калі ваш няўлічаны даход перавысіць 7 тысяч рублёў... У гэтым выпадку вамі зацікавяцца аналітыкі з падатковай

Падатковыя органы валодаюць неабходнымі данымі аб даходах работнікаў у нашай краіне, пачынаючы з інфармацыі аб набыцці транспартных сродкаў, нерухомай і іншай маёмасці, а таксама аб звестках пра грашовыя пераводы, якія паступаюць з-за мяжы. У ведамстве створана спецыяльная група экспертаў, што бяруць інфармацыю аб даходах і параўноўваюць яе з рэальнымі расходамі асобнага далёка не беднага грамадзяніна.

Так, напрыклад, інспекцыяй МПЗ па Кастрычніцкім раёне горада Гродна праведзена камеральная праверка адпаведнасці расходаў і даходаў у дачыненні да грамадзяніна, які з'яўляецца кіраўніком і заснавальнікам двух суб'ектаў гаспадарання, што ажыццяўлялі дзейнасць у галіне грузаперавозак, а таксама аптовага гандлю аўтазапчасткамі. На падставе аналізу наяўных у падатковым органе звестак гэтыя арганізацыі сістэматычна выплачвалі работнікам заработную плату ніжэйшую за мінімальны гарантаваны ўзровень і, як вынік, мелі рызыку ўтойвання падатковай базы па падаходным падатку і выплаты заработнай платы «ў канвертах».

У ходзе праверкі ўстаноўлены факты неаднаразовай пазыкі грамадзянам на разліковыя рахункі названых арганізацый на суму больш чым 60 тысяч рублёў. Акрамя таго, ім не раз давалі сродкі ў буйным памеры на набыццё нерухомасці і транспарту. З улікам такіх абставін устаноўлена перавышэнне расходаў над даходамі ў памеры 50 тысяч рублёў, і па выніках праверкі прад'яўлены падаходны падатак у суме 12,1 тысячы рублёў.

У цэлым у першым паўгоддзі гэтага года, прааналізаваўшы інфармацыю аб даходах, расходах і маёмасным становішчы шэрагу грамадзян, былі запатрабаваныя дэкларацыі аб даходах і маёмасці тых, у каго расходы значна перавышалі атрыманыя даходы.

Сяргей КУРКАЧ.

Медыяпрастора

НАЙЛЕПШЫЯ СТУДЭНЦКІЯ СМІ — З БЕЛАРУСІ

Інтэрнэт-рэсурс факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта Studlive.by перамог у намінацыі «Лепшы маладзёжны СМІ ЕАЭС» на Міжнародным форуме «Прастора Еўразіі».

На форуме праект прадставіла галоўны рэдактар, чацвёртакурсніца факультэта журналістыкі Марына Кішкурна. «Выступоўцам трэба было адмыслова расказаць пра рэсурс і аргументавана адказаць на пытанні журы і аўдыторыі. Барацьба за перамогу разгарнулася сярод моцных удзельнікаў, у ліку якіх лаўрэаты прэміі мінулых гадоў, аднак высокую ацэнку атрымаў менавіта БДУ», — падзялілася ўражаннямі студэнтка.

Свае медыярэсурсы маладыя журналісты заяўлялі ў пяці намінацыях: «Найлепшы галоўны рэдактар студэнцкага СМІ», «Найлепшы маладзёжны СМІ ЕАЭС», «Найлепшы студэнцкі медыяпраект», «Найлепшае студэнцкае радыё» і «Найлепшае студэнцкае ТБ».

Акрамя таго, у скарбонцы беларусаў — яшчэ адна перамога на форуме. Найлепшым студэнцкім тэлебачаннем прызнаны праект «СтудТБ БДПУ» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

Усяго ў форуме прынялі ўдзел 350 маладых эканамістаў, палітолагаў, дыпламатаў, гісторыкаў, журналістаў з Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана і Расіі ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў.

Studlive.by — студэнцкі інтэрнэт-рэсурс факультэта журналістыкі БДУ. Створаны ў маі 2012 года для рэалізацыі журналісцкага патэнцыялу студэнтаў і абітурыентаў ВНУ. На партале публікуюцца навіны журфака, інтэрв'ю з творчымі людзьмі, спартыўныя рэпартажы, матэрыялы пра канцэрты і выстаўкі, карысныя парады, вершы, апавяданні і г. д.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У рэгіёне

У БАРАНАВІЧАХ НАВУЧАЦЬ КІНАЛОГІІ

Курс #Хочу_в_кинологи арганізоўваюць мясцовы БРСМ і баранавіцкі кінолаг Ірына Туціна. Першыя заняткі запланаваны на 6 лістапада. У праекце прапаноўваюць паўдзельнічаць хлопцам і дзяўчатам 14—20 гадоў.

У праграме курса — па 10 тэарэтычных і практычных заняткаў. Іх будуць праводзіць кінолаг, ветэрынарны ўрач і іншыя спецыялісты. Слухачоў курса не толькі навучаць базавым асновам дрэсіроўкі сабак, але і раскажуць пра асаблівасці натуральнага асяроддзя пражывання жывёл, праблемы паводзін.

Далучыцца да курса могуць не толькі ўладальнікі сабак. Тым, хто яшчэ не абзавёўся гадаванцам, арганізатары дапамогуць для навучання падабраць чатырохлапага напарніка, які знаходзіцца на ператрымцы.

Мэта акцыі — развіць пачуццё адказнасці, каб маладыя людзі разумелі, як трэба ладзіць з сабакамі і выхоўваць іх. Ну і прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы бяздомных жывёл. Яны проста так не аказваюцца на вуліцы — да гэтага прыкладае руку менавіта чалавек.

УРОН У 1,8 МІЛЬЁНА РУБЛЁЎ

Суд Віцебскага раёна разгледзеў крымінальную справу ў дачыненні да 45-гадовага жыхара Віцебска, які абвінавачваўся ў махлярстве ў асабліва буйным памеры, паведаміла прэс-служба абласнога суда.

Абвінавачаны з ліпеня 2016 года да лістапада 2020-га ў Мінску, Віцебску і Оршы пад рознымі падставамі пераконваў людзей, цяпер ужо пацярпелых, браць крэдыты ў банках і затым перадаваць яму гэтыя грошы. Ён абяцаў пагасіць крэдыты і вярнуць пазычаныя сумы, але не збіраўся гэтага рабіць. У выніку ашуканскіх дзеянняў мужчына завалодаў сродкамі 68 чалавек на суму Br1,8 млн.

Суд прыгавараў віцябляніна да чатырох гадоў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму і штрафу ў Br2,9 тыс. Таксама з абвінавачанага ў карысць пацярпелых спагнаныя розныя сумы ў якасці кампенсацыі.

За 15 пацярпелымі прызнана права на задавальненне грамадзянскага іску аб спагнанні з абвінавачанага прычыненай маёмаснай шкоды і выдаткаў па аказанні юрыдычнай дапамогі. Таксама за пяццю пацярпелымі прызнана права на задавальненне грамадзянскага іску аб спагнанні з абвінавачанага прычыненай маёмаснай шкоды ў парадку грамадзянскага судаводства.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэм'ер Польшчы: Еўропа стаіць на парозе вялізнага энергетычнага крызісу

Еўропа апынулася на парозе энергетычнага крызісу, які ўжо праз некалькі тыдняў можа стаць шокам, заявіў прэм'ер-міністр Польшчы Матэуш Маравецкі, выступаючы ў Еўрапейскім парламенце ў Страсбургу, дзе праходзяць дэбаты па перавазе польскай канстытуцыі над еўрапейскім правам, піша ТАСС.

«Мы сёння стаім каля парога вялізнага газавага і энергетычнага крызісу. Хутка растуць цэны: ужо цяпер многія фірмы ў Еўропе стаяць перад выбарам — абмяжоўваць вытворчасць або перакладаць затраты на спажыўцоў», — сцвярджае кіраўнік польскага ўрада.

Узровень крызісу ўжо ў найбліжэйшыя тыдні можа ўзрушыць Еўропу. Многія прадпрыемствы могуць абанкруціцца, а мільёны дамашніх гаспадарак, дзясяткі мільёнаў сем'яў газавы крызіс можа зрабіць жабракамі ў сувязі з некантралюемым ростам цэн ва ўсёй Еўропе.

«Трэба ўлічваць і эфект даміно. Адзін крызіс можа каскадам пацягнуць за сабой новыя ўзрушэнні», — папярэдзіў ён.

У Вялікабрытаніі пацыенты па двое сутак чакаюць месца ў стацыянары

У брытанскіх шпіталях пацыентам, якіх даставілі на хуткай дапамозе, прыходзіцца 40—50 гадзін чакаць, пакуль вызваліцца месца ў стацыянарным бальнічным аддзяленні, паведамляе The Independent.

Пацыенты розных брытанскіх бальніц расказалі выданню, што больш за 40 гадзін прачакалі ў аддзяленні, куды іх даставіла хуткая дапамога. Па словах персаналу, цяпер у краіне гэта звычайная з'ява. Пры гэтым некаторыя пацыенты чакалі 13 гадзін у машыне хуткай дапамогі, перш чым трапіць у прыёмнае аддзяленне. «Амаль кожны дзень ложкаў чакаюць больш за 40 гадзін. Мы не можам даць нашым пацыентам належны догляд», — сказаў адзін з урачоў.

«Персанал усё больш турбуецца аб здольнасці Нацыянальнай службы аховы здароўя справіцца з сітуацыяй. Ураду неабходна ўсвядоміць патэнцыяльны крызіс і дапамагчы службам аховы здароўя ў рашэнні пастаўленых перад імі задач», — заявіла прэзідэнт Каралеўскага каледжа экстраннай медыцыны доктар Кэтрын Хендэрсан.

Адзначаецца, што крызісная загружанасць характэрная звычайна для зімовага перыяду, але сёлета яна наступіла раней. Сёння ў Вялікабрытаніі заняты 91 % усіх бальнічных ложкаў, пры гэтым паказчык, які перавышае 85 %, лічыцца небяспечным узроўнем.

Дзярждэп пачаў расследаванне спынення Байдэнам аперацый у Афганістане

Генеральны інспектар Дзярждэпартамента ЗША Даяна Шоў апавясціла Кангрэс аб пачатку расследавання спынення адміністрацыяй прэзідэнта ЗША Джо Байдэна дыпламатычных аперацый у Афганістане. Пра гэта паведамляе Politico са спасылкай на афіцыйныя даныя Дзярждэпартамента і Кангрэса.

Праверка будзе праводзіцца сумесна з інспектарамі іншых ведамстваў. Так, генеральны інспектар Пентагона зоймецца ацэнкай няўдалага ўдару беспілотніка ў Кабуле, у выніку якога загінулі дзесяць мірных жыхароў, а таксама падрабязна разбярэ працэс праверкі Міністэрствам абароны эвакуіраваных афганцаў.

Асаблівую цікавасць наглядальных органаў выклікала праграма Дзярждэпартамента па прадастаўленні афганскім перакладчыкам, іх сем'ям і іншым асобам, якія працавалі на амерыканскі ўрад, магчымасці эміграваць у ЗША. Паводле звестак выдання, спецыяльная праграма, запушчаная ў 2009 годзе, буксавала ад бюракратычных праблем. Перад жнівеньскай эвакуацыяй на яе разглядзе знаходзілася каля 18 тысяч заяў.

ЗАБЕСПЯЧЭННЕ НАЙВАЖНЕЙШЫ НАПРАМАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Так, калі звярнуцца да лічбаў, валавы збор збожжавых і зернебабовых з кукурузай у вазе пасля дапрацоўкі ў сярэднім за пяць гадоў у сельскагаспадарчых і фермерскіх арганізацыях склаў 7,3 млн тон, сёлета атрымана 7,4 млн тон, або 101 працэнт ад сярэдняга за пяць гадоў.

У мэтах гарантаванага забеспячэння насельніцтва краіны хлебабулачнымі, крупянымі, макаронными вырабамі па даступных цэнах аб'ём дзяржзаказу на харчовае збожжа па фіксаваных дзяржавай цэнах у гэтым годзе вызначаны ў памеры 831 тыс. тон, або 11 працэнтаў ад усёй валавой вытворчасці збожжа.

Такім чынам, пастаўка харчовага збожжа для дзяржаўных патрэб выканана ў поўным аб'ёме. Акрамя таго, атрыманы аб'ём збожжа дазволіць засыпаць неабходны насенны фонд — 0,8 млн тон — і забяспечыць патрэбы жывёлагадоўлі ў аб'ёме 5,2 мільёна тон.

Што датычыцца вытворчасці рапсу сёлета, то яна склалася ў аб'ёме 720 тыс. тон, або 137 працэнтаў да сярэдняга паказчыка за пяцігодку. Для забеспячэння патрэбнасці прадпрыемстваў алейнатлушчавай, кандытарскай галіны, рэалізацыі ў рознічную сетку рапсавага алею дзяржзаказ на пастаўку масланасення рапсу сёлета вызначаны ў аб'ёме 100 тысяч тон, або 14 працэнтаў чаканай вытворчасці ў 2021 годзе (720 тыс. тон). Дзяржзаказ на пастаўку масланасення рапсу ўжо завершаны. Астатнія аб'ёмы масланасення рапсу і рапсавага алею, як і ў мінулыя гады, запатрабаваныя на знешніх рынках.

Цяпер вядзецца масавая ўборка цукровых буракоў. Ураджайнасць вышэйшая за леташнюю, што дазваляе прагназаваць валавы збор не меншы за 4,6 млн тон, або 104 працэнты да сярэдняга за мінулыя пяць гадоў. Для поўнага забеспячэння ўнутранага рынку краіны цукрам айчыннай вытворчасці дзяржаўны заказ на пастаўку цукровых буракоў складае 3 млн тон, астатнія 1,8 млн тон будуць пастаўлены і перапрацаваныя для пастаўкі цукру на экспарт.

Засушлівыя ўмовы чэрвеня—ліпеня прывялі да зніжэння тэмпаў нарыхтоўкі травяных кармоў у названы перыяд, у сувязі з чым чаканыя аб'ёмы іх нарыхтоўкі складуць 9,4 млн тон кармавых адзінак. З улікам рэшткаў мінулага года (2,6 млн тон) дадзеныя аб'ёмы вытворчасці травяных кармоў дазволяць забяспечыць патрэбы жывёлагадоўлі ў поўным аб'ёме.

У краіне завяршаецца масавая ўборка бульбы і пладова-агароднінная прадукцыі. У сельскагаспадарчых арганізацыях і сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках чаканая вытворчасць бульбы складае каля 900 тыс. тон, больш за 630 тыс. тон агародніны, а таксама 170 тыс. тон пладоў і ягад.

Магу з упэўненасцю заявіць, што сёлетні ўраджай дасць магчымасць забяспечыць ўнутрырэспубліканскія патрэбы, уключаючы закладку стабілізацыйных фондаў на міжсезонны перыяд, пастаўку сыравіны для прамысловай перапрацоўкі, рэалізацыю прадукцыі ў рознічную сетку, іншую рэалізацыю, а таксама мець свабодныя рэсурсы для пастаўкі на экспарт. Нарошчванне пладовай прадукцыі ажыццяўляецца за кошт штогадовай закладкі прамысловых садоў на плошчы не менш за 500 гектараў.

Дадам, што ў перыяд масавай уборкі ўраджаю сельскагаспадарчыя арганізацыі і сялянскія гаспадаркі актыўна ўдзельнічаюць у восеньскіх кірмашах, выязным гандлі на спецыяльных пляцоўках, дзе прадукцыя рэалізоўваецца непасрэдна ад вытворцаў па больш прымальных цэнах.

— З якімі цяжкасцямі давялося сутыкнуцца аграрыям у працэсе ўборачнай кампаніі? Якія ўрокі можна атрымаць на будучыню?

— Асноўная цяжкасць, з якой сёлета давялося сутыкнуцца аграрыям у працэсе ўборачнай кампаніі, заключаецца ў адначасовым паспяванні як азімых, так і яравых культур, рапсу. Яна звязаная перш за ўсё з высокімі тэмпературамі і недахопам вільгаці ў перыяд фарміравання ўраджаю.

У сувязі з тым, што ў апошнія гады ў чэрвені—ліпені адчуваецца востры недахоп вільгаці ў глебе, перад сельскагаспадарчымі арганізацыямі краіны ставіцца задача на будучыню — павялічыць плошчы сяўбы азімых культур да 70 працэнтаў у структуры збожжавых каласавых.

— Наколькі актыўна ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўкараняюцца новыя тэхналогіі, якая новая тэхніка з'явілася ў арсенале механізатараў?

— Стратэгія развіцця ў галіне механізацыі сельскай гаспадаркі накіравана на стварэнне машынна-трактарнага парку, які дазваляе праводзіць сельскагаспадарчыя работы па сучасных тэхналогіях у аптымальныя агратэхнічныя тэрміны, пры гэтым новыя тэхналогіі ўкараняюцца на пастаяннай аснове.

Сёння ўжо нікога не здзівіш укараненнем элементаў сістэм дакладнага земляробства, таму што некаторыя віды тэхнікі (трактары, апырсквальнікі, машыны для ўнясення ўгнаенняў, збожжаўборачныя камбайны і іншае) імі камплектуюцца ўжо з завода. У сельскагаспадарчых арганізацыях эксплуатуецца звыш 18 тыс. адзінак тэхнікі, абсталяванай элементамі сістэм дакладнага земляробства. Для паўнавартаснага выкарыстання такіх элементаў і сістэм неабходныя адпаведныя кадры.

Разам з дзеючай лабараторыяй дакладнага земляробства на базе ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчая акадэмія», у гэтым годзе з удзелам Мінсельгасхарча, на базе ўстановы адукацыі «Глыбоцкі дзяржаўны прафесійны ліцэй» адкрыты Цэнтр дакладнага земляробства. Стварэнне дадзенага цэнтра будзе садзейнічаць павышэнню ўзроўню падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэнню кваліфікацыі кадраў у галіне пашырэння выкарыстання тэхналогій дакладнага земляробства ў сельскай гаспадарцы.

Таксама з удзелам спецыялістаў Мінсельгасхарча штогод на палях краіны праходзяць выпрабаванні новых узораў сельскагаспадарчай тэхнікі. Напрыклад, сёлета праходзяць выпрабаванні шыроказахопныя сеялкі, мадэрнізаваныя збожжаўборачныя камбайны, апырсквальнікі і іншая тэхніка.

Вялікая ўвага своечасоваму абнаўленню і дааснашчэнню парку аддаецца з боку кіраўніка дзяржавы і ўрада Рэспублікі Беларусь. З пачатку года ў сельскагаспадарчыя арганізацыі паступіла звыш 3,5 тыс. адзінак тэхнікі і абсталявання, у тым ліку 315 збожжаўборачных і 145 кормаўборачных камбайнаў, больш за 650 адзінак трактароў, іншыя неабходныя машыны. Абнаўленне існуючага машынна-трактарнага парку новай тэхнікай дазваляе вырабляць прадукцыю раслінаводства і жывёлагадоўлі па сучасных тэхналогіях і канкурыраваць на сусветных рынках.

— Якія вы бачыце экспартныя перспектывы ў АПК Рэспублікі Беларусь? З якімі краінамі і рэгіёнамі будзе развівацца супрацоўніцтва?

— За два апошнія дзесяцігоддзі краіна значна прыбавіла — як у вытворчасці мясамалочнай і раслінаводчай прадукцыі, так і ў яе экспарце. Толькі ўявіце: у першыя гады незалежнасці наш экспарт крыху перавышаў 100 мільёнаў долараў ЗША, а ўжо ў 2020 годзе мы дасягнулі сумы ў 5,8 мільярда долараў ЗША.

Сёння брэнд «Зроблена ў Беларусі» атрымаў заслужанае прызнанне на сусветных рынках. Нас ведаюць як пастаўшчыкоў якасных сыравіны, сухога малака і сметанковага масла. Прычым па гэтых пазіцыях мы ўваходзім у пяцёрку, а па мясе ялавічыны і птушкі — у дзясятку краін — сусветных экспарцёраў. І гэта заканамерна: пытанні якасці прадуктаў харчавання і эксперту кантралююцца на дзяржаўным узроўні.

Прыкладзены сур'ёзныя намаганні, каб пашырыць нашу прысутнасць на замежных прылаўках. Мы актыўна развіваем экспарт гатовай перапрацаванай мяса-малочнай прадукцыі, мясных кансерваў і каўбасных вырабаў, якіх у цэлым у Беларусі вырабляецца больш за 1500 відаў. Акрамя таго, заслугоўвае ўвагі экспарт прадукцыі раслінаводства, і ў прыватнасці, свежых агародніны і бульбы.

Калі разгледзець апошнюю пяцігодку, то экспарт павялічыўся практычна на 30 %, дадатнае знешнегандлёвае сальда з 155 млн долараў у 2016 годзе вырасла да 1,5 млрд у 2020 годзе. Дынаміку росту мы адзначаем і сёлета. За восем месяцаў гэтага года экспарт харчовых тавараў і сельскагаспадарчай сыравіны склаў 4,1 млрд долараў ЗША, і ў параўнанні з аналагічным перыядам 2020 года вырас на 10,8 працэнта. Прырост склаў 400,3 млн долараў ЗША. Экспартныя пастаўкі беларускіх прадуктаў харчавання ажыццяўляліся ў 99 краін свету. У цэлым вырас экспарт малака і малакапрадуктаў, ялавічыны, каўбасных вырабаў, рыбы і рыбнай прадукцыі, яек, бульбы, рапсавага алею.

Такім чынам, кажучы мовай лічбаў, ні пандэмічная сітуацыя, ні знешнепалітычныя фактары не аказалі істотнага ўплыву на работу экспарцёраў: рэалізоўваюцца раней заключаныя кантракты, заключаюцца новыя, ажыццяўляюцца адгрузкі прадукцыі. Вядома, пэўныя пытанні ёсць: сталі больш жорсткія ўмовы канкурэнцыі сярод вытворцаў, з'яўляюцца разрывы лагістычных ланцужкоў пры пастаўках тавараў на рынкі далёкага замежжа. Але, тым не менш, попыт на беларускую сельскагаспадарчую прадукцыю і прадукты харчавання не змяняецца і па прагнозах будзе ўстойлівы да канца года. Па выніках 2021-га мы плануем павялічыць экспарт да 6 мільярдаў долараў ЗША. Станоўчая дынаміка, якая намецілася з пачатку года нават ва ўмовах пандэміі, сур'ёзна абнадзейвае.

Мы будзем прытрымлівацца задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы ў рамках Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады: не дапусціць скарачэння прысутнасці нацыянальнай экспартнай прадукцыі на традыцыйных рынках збыту, а таксама захаваць шматвектарнасць знешняга гандлю, асвойваючы новыя нішы сусветнага рынку.

Асноўным напрамкам экспарту застануцца краіны СНД, у тым ліку Расійская Федэрацыя, якія прыносяць найбольшую эканамічную выгаду экспарцёрам. Працягнем развіваць азіяцкі кірунак, у тым ліку Кітай, плануем павялічыць экспарт у краіны Персідскага заліва, Афрыкі і Амерыкі.

— Несумненным дасягненнем жывёлагадоўчага сектара АПК з'яўляецца тое, што Рэспубліка Беларусь увайшла ў пяцёрку сусветных лідараў па экспарце малака. Як атрымалася дасягнуць такога поспеху?

— За апошнія гады Беларусь атрымала статус аднаго з вядучых экспарцёраў харчавання — у значнай ступені дзякуючы аб'ёмным продажам малочнай і мясной прадукцыі. Важна разумець, што ўсё гэта ідзе не на шкоду харчовай бяспецы краіны.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выразна абазначыў дзяржаўную пазіцыю: сельская гаспадарка, наша харчовая бяспека і незалежнасць — найважнейшыя прыярытэты для краіны. Таму забеспячэнне харчовай бяспекі — гэта найважнейшы напрамак нацыянальнай палітыкі. Меры рэагавання, якія прымаюцца ўрадам і ўпаўнаважанымі органамі, дазваляюць улічваць усе змены на рынку харчавання як унутры краіны, так і за яе межамі. Наша краіна мае добры патэнцыял у аграрнай сферы і можа цалкам забяспечыць як уласную харчовую бяспеку, так і рост паставак харчавання за мяжу.

Так, сёння мы працуем ва ўмовах абмежавання росту ўнутраных цэн на прадукцыю першай неабходнасці. Гэта мясная і малочная прадукцыя, птушка, яйкі, хлеб, мука, крупы, фруктова-агароднінная прадукцыя. Такая палітыка выпрацавана з мэтай гарантаванага забеспячэння харчаваннем насельніцтва па даступных цэнах. Усе пастаўкі прадукцыі гандлёвым арганізацыям ажыццяўляюцца на падставе заключаных дагавораў у адпаведнасці з іх заяўкамі.

Адначасова з гэтым урад і ўпаўнаважаныя органы маніторацъ існуючы запас трываласці перапрацоўчых арганізацый. Магу запэўніць: ніякі дэфіцыт харчавання Беларусі не пагражае. Наша краіна займае лідзіруючыя пазіцыі сярод краін ЕАЭС па ўзроўні самазабеспячэння прадуктамі харчавання — 96 %. Па даных Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН, у свеце ўзровень сярэднедушавога спажывання мяса складае 44 кілаграмы на чалавека ў год, у той час як у Беларусі — 97, а пры сярэднесусветным спажыванні малочных прадуктаў 112 кілаграмаў у нас — 248. Для параўнання: летась на душу насельніцтва мы вырабілі 137 кілаграмаў мяса і 828 — малака. Узровень самазабеспячэння складае 134 і 244 % адпаведна.

Але каб з году ў год прырастаць паказчыкамі, мала мець жаданне, патрэбная база. Па-першае, у краіне ідзе ўстойлівы рост вытворчасці. У мінулым годзе надаілі больш за 7,7 млн тон малака і рэалізавалі на забой больш за 1,7 млн тон жывёлы і птушкі ў жывой вазе. Тэмп росту за пяцігодку — 110 і 106 % адпаведна. Станоўчая дынаміка росту аб'ёмаў вытворчасці захоўваецца і ў гэтым годзе.

Уласна, набірае тэмпы і перапрацоўка. Так, за восем месяцаў гэтага года аб'ём малака, які паступіў на перапрацоўку, вырас на 1 %, таксама забяспечаны і тэмп росту вытворчасці асноўных экспартных пазіцый: сыроў тлустых — на 3 %, сухога неразведзенага малака — на 52 %, сухой малочнай сыроваткі — на 7 %, каўбасных вырабаў — больш чым на 7 %, а мясных паўфабрыкатаў — на 23 %.

Па-другое, у арганізацыях АПК не скідваюць з рахунку тэхнічнае перааснашчэнне вытворчасцяў, мадэрнізацыю абсталявання і ўкараненне перадавых тэхналогій, што непазбежна павышае якасць выпускаемай прадукцыі. Возьмем, напрыклад, малако. Калі ў 2016 годзе сельгаспрадпрыемствы рэалізавалі яго 44,8 % гатункам экстра, то ў 2020-м — ужо амаль 60 %. Пры гэтым атрымалася сысці ад другога і максімальна, да 12 %, скараціць прысутнасць першага гатунку малака.

На перапрацоўчых прадпрыемствах укараняюцца сістэмы кантролю якасці і бяспекі, а наглядныя органы адсочваюць бяспеку і якасць сыравіны ды гатовай прадукцыі «ад поля да прылаўка». Якасць нашых прадуктаў

ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ — НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ

харчавання адпавядае ўсім нацыянальным і міжнародным патрабаванням.

Для дасягнення такога ўзроўню вытворчасці штогод прымаліся важныя рашэнні на ўзроўні кіраўніцтва дзяржавы, накіраваныя на фінансаванне мерапрыемстваў па інтэнсіфікацыі галіны. У малочнай жывёлагадоўлі было праведзена маштабнае абнаўленне вытворчай базы за кошт будаўніцтва, рэканструкцыі і мадэрнізацыі малочнатварных фермаў для ўкаранення сучасных рэсурсазберагальных тэхналогій вытворчасці. У цяперашні час на гэтых фермах вырабляецца каля 70 працэнтаў малака.

Новыя тэхналогіі значна палепшылі якасныя паказчыкі малака-сыравіны, што дазволіла перапрацоўчай прамысловасці пашырыць магчымасці вытворчасці канкурэнтаздольнай малочнай прадукцыі на ўнутраным і знешнім рынках. Дзякуючы абнаўленню вытворчых магутнасцяў у малочнай жывёлагадоўлі створана адна з самых эфектыўных вытворчасцяў у агрtoпрамысловым комплексе. Рэнтабельнасць продажу малака за I паўгоддзе 2021 года склала 22,4 працэнта.

— Што робіцца для паляпшэння ўмоў працы і быту работнікаў АПК, якія сельгасарганізацыі можна ў гэтым плане ўзяць для прыкладу?

— Я думаю, сёння на нашых вачах адкрываецца новая старонка ў гісторыі беларускага агрaпрамысловага комплексу. Сельская гаспадарка інтэнсіўна развіваецца, у вытворчасць укараняюцца інавацыйныя тэхналогіі, сучасныя высокапрадукцыйныя і энергаэфектыўныя машыны і абсталяванне, інфармацыйныя сістэмы кіравання тэхналагічнымі лініямі і аперацыямі. На палеткі і фермы прыходзяць робаты, укараняюцца біятэхналогіі, актыўна прымяняюцца найноўшыя навуковыя распрацоўкі і дасягненні.

Але галоўнае, што дазваляе агрaпрамысловаму комплексу развівацца, — гэта людзі, якія працуюць у галіне, спецыялісты, што валодаюць сучаснымі ведамі і навыкамі кіравання інавацыямі ў вытворчасці. Для павышэння прэстыжу працы і матывацыі пражывання ў сельскай мясцовасці на дзяржаўным узроўні ўжо шмат зроблена. Створаны аграгарадкі — сельскія населеныя пункты з развітой сацыяльнай, інжынернай і транспартнай інфраструктурай. Дзейнічае шэраг нарматыўных прававых актаў, накіраваных на замацаванне кадраў на вёсцы. Гэта ўказы кіраўніка дзяржавы і пастановы ўрада па пытаннях аплаты працы, прадастаўлення льготных крэдытаў маладым спецыялістам на набыццё хатняй маёмасці і тавараў першай неабходнасці, адтэрміноўкі ад прызыву на тэрміновую ваенную службу на перыяд работы на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання і службу ў рэзерве, паляпшэння забеспячэння жыллём і іншае.

Акрамя таго, згодна з тарыфным пагадненнем паміж Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, Беларускім прафесійным саюзам работнікаў агрaпрамысловага комплексу і Рэспубліканскім агрaпрамысловым саюзам «БелАПС» прадугледжаны дадатковыя меры, накіраваныя на замацаванне кадраў. У іх ліку:

— вылучэнне сельскагаспадарчымі арганізацыямі сродкаў у мэтах кампенсацыі спецыялістам, рабочым (служачым) затрат на наём жылых памяшканняў у выпадку адсутнасці магчымасці выдзялення ім добраўпарадкаваных жылых памяшканняў;

— прадастаўленне маладым сем'ям са сродкаў арганізацыі пазык, пазык на будаўніцтва або набыццё жылля, куплю прадметаў працяглага карыстання для хатняга ўжытку, на навучанне на платнай аснове па спецыяльнасцях, у якіх мае патрэбу арганізацыя, і іншае.

Палажэнні тарыфнага пагаднення ўключаюцца ў калектыўныя дагаворы сельгасарганізацый.

У галіне шмат прыкладаў сельскагаспадарчых арганізацый, станоўчы вопыт работы якіх можна разглядаць як прыклад: «Агракамбінат Сноў» Нясвіжскага раёна, сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Калгас «Радзіма» Бялыніцкага раёна, ААТ «Рассвет імя К. П. Арлоўскага» Кіраўскага раёна, Мінскае раённае ўнітарнае прадпрыемства «Агракамбінат «Ждановічы», адкрытае акцыянернае таварыства «Астрамечава», вытворчы кааператыў імя У. І. Крамко і вучэбна-доследны сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Путрышкі» Гродзенскага раёна, ААТ «Граніт-Агра» Дзятлаўскага раёна, КСУП «Агра-Солы» Смаргонскага раёна, ААТ «Ціхінічы» Рагачоўскага раёна і іншыя.

У мэтах стварэння камфортных умоў пражывання ў вёсцы ўрад сумесна з рэгіёнамі праводзіць работу па рэалізацыі канцэпцыі «вёска будучыні». Гэта будуць своеасаблівыя аграгарадкі новага ўзроўню з развітой і мадэрнізаванай сацыяльнай інфраструктурай, высокім узроўнем добраўпарадкавання, калі ў межах аднаго населенага пункта ёсць не толькі неабходны мінімум сэрвісаў, але і нейкія дадатковыя.

Планамі па пераўтварэнні ў 2019—2020 гадах па краіне быў ахоплены 171 населены пункт з агульным лікам насельніцтва 145 тысяч чалавек. У сельскіх населеных пунктах выконваліся работы, накіраваныя на комплекснае развіццё такіх тэрыторый, у тым ліку на добраўпарадкаванне вуліц, азеляненне, уладкаванне спартыўных пляцовак, устаноўку малых архітэктурных формаў, мадэрнізацыю інжынерна-транспартнай інфраструктуры, па будаўніцтве, бягучым і капітальным рамонце ўстаноў аховы здароўя і адукацыі, аб'ектаў жыллёвага фонду, сацыяльна-культурнага прызначэння і бытавога абслугоўвання, сельскіх дарог, а таксама вытворчых аб'ектаў сельскагаспадарчага прызначэння. Праводзіліся газіфікацыя аграгарадкоў, рэканструкцыя ліній электрапередачы.

— Што робіцца для замацавання работнікаў у сельгаспрадпрыемствах, асабліва маладых спецыялістаў — выпускнікоў аграрных навучальных устаноў?

— Адна з прыярытэтных задач сёння, якая патрабуе пільнай увагі, — забеспячэнне прафесійнымі кадрамі нашага АПК. У аснове яе знаходзіцца якасная адукацыя, якая адпавядае ўсім патрабаванням сучаснай вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і прадуктаў харчавання. Я лічу, што адукацыя можа і павінна стаць лакаматывам для вёскі. Нашы аграрныя адукацыйныя ўстановы — адны з найстарэйшых у Беларусі, яны назапасілі багатую спадчыну.

Сёння падрыхтоўку кадраў для аграрнага сектара ў асноўным вядуць чатыры ВНУ: Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія, Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны і Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт, 27 аграрных каледжаў. Штогод у арганізацыі агрaпрамысловага комплексу накіроўваецца каля 1,8 тысячы спецыялістаў з вышэйшай, 7 тысяч з сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыяй.

Вядома, ні для кога не сакрэт, што ў апошнія гады ў моладзі прывабнымі з'яўляюцца спецыяльнасці ў сферы ІТ-тэхналогій. Аграрныя прафесіі менш папулярныя. Разумеючы важнасць падрыхтоўкі кадраў для вёскі, на дзяржаўным узроўні пастаянна прымаюцца меры, накіраваныя на павышэнне прэстыжу сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў. Такіх ільгот няма ні для адной іншай галіны народнай гаспадаркі.

Нават у гарадах няма такіх ільготных умоў, якія створаны для спецыялістаў, якія пражываюць у сельскай мясцовасці і працуюць у сельскагаспадарчых арганізацыях. Выпускнікі аграрных ВНУ і каледжаў маюць магчымасць без праблем уладкавацца на работу ў арганізацыях галіны, стаць паспяховымі кіраўнікамі, прасунуцца па службовай лесвіцы.

І такіх прыкладаў мноства. Многія дзяржаўныя дзеячы, вядомыя навукоўцы, акадэмікі, кіраўнікі цэлых галін і буйных прадпрыемстваў, дыпламаты скончылі аграрныя ВНУ. Практычна дзве трэці кіраўнікоў у рэгіёнах маюць сельскагаспадарчую адукацыю.

Кіраўніком дзяржавы і ўрадам Рэспублікі Беларусь вялікая ўвага аддаецца стварэнню ўмоў для замацавання кадраў у сельскай гаспадарцы. Як правіла, эканамічна моцныя арганізацыі, якія рэалізоўваюць матэрыяльныя і сацыяльныя стымулы, устаноўленыя нарматыўнымі прававымі актамі, не адчуваюць праблем з кадрамі. Як паказвае практыка, найбольш паспяховая замацоўваецца ў сельскагаспадарчых арганізацыях пасля заканчэння ВНУ вясковая моладзь. Яна адаптаваная да ўмоў сельскага жыцця і ў сваёй большасці свядома выбірае будучую спецыяльнасць.

Таму асноўнай задачай кадравай палітыкі галіны з'яўляецца прыцягненне ў аграрныя ўстановы адукацыі моладзі, знаёмай са спецыфікай сельскага ўкладу жыцця і вытворчасцю. У гэтых мэтах з 2018 года ў школах адкрытыя профільныя класы аграрнай накіраванасці. Навучэнцы такіх класаў па праграме факультатыўнага занятку «Уводзіны ў аграрныя прафесіі» ў 10-11 класах вывучаюць пытанні ўводзінаў у аграрную вытворчасць, свет сельскагаспадарчых раслін і жывёлы, асновы тэхналогій атрымання прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі і іншыя. Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі функцыянуюць 535 профільных класаў аграрнай накіраванасці, у якіх навучаецца 3558 навучэнцаў.

Меры, што прымаюцца, аказваюць станоўчы ўплыў на паляпшэнне сітуацыі з забяспечанасцю кадрамі сельскагаспадарчых арганізацый краіны. Яны дазволілі стабілізаваць дынаміку замацавання маладых спецыялістаў у галіне — такім чынам, зменшыць адток моладзі з сельскіх тэрыторый. Пасля абавязковых двух гадоў работы па размеркаванні ў сельскагаспадарчых арганізацыях працягвае працаваць больш за 50 % спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй (у 2008 годзе — 35 %). Такі ўзровень замацавання падтрымліваецца на працягу апошніх сямі гадоў.

— Наколькі вялікі ўнёсак беларускай навукі ў развіццё АПК? Якія новаўвядзенні будуць укаранёныя ў найбліжэйшай будучыні?

— Беларускія вучоныя штогод аказваюць важкую дапамогу сельгасвытворцам па двух асноўных напрамках:

— распрацоўка новых і ўдасканаленне існуючых тэхналогій, рэкамендацый і галіновых рэгламентаў, стварэнне высокапрадукцыйных сартоў сельскагаспадарчых культур і парод жывёлы, распрацоўка рэсурсазберагальных тэхнічных сродкаў, а таксама іншай навукова-тэхнічнай прадукцыі ў рамках выканання дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм і дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў;

— навучанне спецыялістаў па праграмах павышэння кваліфікацыі, пры гэтым зацікаўленыя гаспадаркі атрымліваюць неабходную ім кансультацыйную дапамогу. На сайце Мінсельгасхарча размешчаны і пастаянна актуалізуюцца рэкамендацыі вучоных па самых разнастайных напрамках работы агрaпрамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь.

Акрамя акадэмічнай навукі, свой уклад у вытворчасць уносяць і навукоўцы ўстаноў вышэйшай адукацыі. Ідзе сумесная, карпатлівая і пастаянная работа, якая і прыносіць вынік.

Цяпер што датычыцца перспектывы. У апошнія гады ўсё часцей узнімаецца пытанне выкарыстання тэхналогій дакладнага земляробства ў Рэспубліцы Беларусь. У цяперашні час Мінсельгасхарчам ва ўзаемадзеянні з зацікаўленымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання арганізавана распрацоўка лічбавай платформы «Дакладнае земляробства», стварэнне якой накіравана на аптымізацыю планавання і вядзення вытворчай дзейнасці ў галіне аператыўнага кіравання вытворчасцю прадукцыі раслінаводства.

— Іван Іванавіч, шчыры дзякуй вам за такую цікавую размову і падрабязныя адказы на нашы пытанні. А ўсім работнікам сельскагаспадарчай вытворчасці хочацца шчыра падзякаваць за іх самаадданую добрасумленную працу!

Сяргей РУЧАНАЎ.

Цалкам інтэрв'ю глядзіце на сайце zviazda.by

Сацыяльны вектар

Клопат — не толькі ў Тыдзень маці

У Беларусі жыве 116 тысяч шматдзетных сем'яў. З іх больш за 80 % маюць трох дзяцей. За дзесяць гадоў колькасць шматдзетных сем'яў у краіне павялічылася больш чым у два разы — на 51 тысячу. І тэндэнцыя не мяняецца: за апошнія паўтара года іх лік вырас на шэсць тысяч. Самая шматдзетная сям'я (у ёй 13 дзяцей) жыве ў Брэсцкай вобласці. Гэты рэгіён увогуле самы шматдзетны: тут 24 тысячы такіх сем'яў. Тры шматдзетныя сям'і, у якіх выхоўваецца па 12 дзяцей, таксама з Брэсты. Нядаўна ў краіне праходзіў Тыдзень маці, але клопат пра жанчын і дзяцей у нас круглагадовы.

Пенсіённыя льготы, адрасная дапамога і сацыяльная перадышка

— У праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады вызначаны прыярытэт — шчаслівая сям'я. А разам з гэтым — умацаванне традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, заснаваных на фізічным і духоўным дабрабыце чалавека, выхаванне дзяцей і клопат аб старэйшым пакаленні, — адзначае **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.**

За апошні год прыняты шэраг новых мер па ўдасканаленні сістэмы падтрымкі сем'яў і мацярынства. З 1 студзеня бягучага года пашыраны пенсійныя льготы для шматдзетных маці, з 9 да 12 гадоў павялічаны перыяд догляду дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, які ўключаецца ў агульны стаж і ўлічваецца пры налічэнні пенсіі. Да 10 гадоў зніжаны страхавы стаж, які патрабуецца для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце для маці, якія нарадзілі і выхавалі чацвярых дзяцей. Для матуль, якія нарадзілі і выхавалі пяць і болей дзяцей, ён складае пяць гадоў.

У сістэме адрасная сацыяльная дапамогі акцэнт таксама робіцца на шматдзетныя сем'і. З 6 да 12 месяцаў павялічаны перыяд атрымання штомесячнай сацыяльнай дапамогі, са 100 да 115 % бюджэту пражыткавага мінімуму павышаны крытэрый патрэбы ў ёй.

Кожнай шматдзетнай сям'і пры падрыхтоўцы да новага вучэбнага года прызначана аднаразовая матэрыяльная дапамога. Сёлета яе атрымалі больш за 110 тысяч шматдзетных сем'яў на 220 тысяч дзяцей-школьнікаў.

Медыцынская падтрымка: клапатлівая паліклініка і бясплатнае ЭКА

— Мы правялі невялікае сацыялагічнае даследаванне і амаль у 10 % арганізацый мужчыны скарысталіся водпускам пасля нараджэння дзіцяці. Каля 43 % арганізацый, якія ўдзельнічалі ў апытанні, даюць такі адпачынак больш чым на 14 дзён, — адзначае Валерый Кавалькоў.

Першы намеснік міністра аховы здароўя старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» Алена БОГДАН засяродзіла ўвагу на вакцынацыі будучых мам і цяжарных жанчын.

— Сёння вакцына, якая маецца ў краіне, дазваляе вакцынаваць цяжарных і тых, хто плануе цяжарнасць у найбліжэйшы час. Мне хочацца, каб мы ўсе адказна ставіліся да ўласнага здароўя, здароўя сваіх дзяцей і бацькоў. І справіцца з каранавірусная інфекцыяй нам дапаможа толькі стварэнне калектыўнага імунітэту, — падкрэсліла Алена Богдан.

Яна адзначыла, што сёлета ў Беларусі рэалізоўваецца праект па стварэнні клапатлівай паліклінікі ў педыятрыі, хоць каранавірусная інфекцыя і ўносіць змены ў гэту работу. Пачала дзейнасць такая ініцыятыва, як бальніца, сяброўская да дзяцей. Гэта атэстацыя радзільных дамоў і дзіцячых бальніц па пэўных крытэрыях Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

З 2021 года сем'ям даецца адна бясплатная спроба ЭКА. На сёння каля 400 сямейных пар скарысталіся гэтай магчымасцю, дадала Алена Богдан.

Алена КРАВЕЦ.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Унитарное предприятие «ИЦТ ГОРИЗОНТ», г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов
Месторасположение: г. Минск, ул. Красная, 7

№ лота	Наименование (назначение)	Инвентарный №	Начальная цена с НДС 20 %
1	Токарно-винторезный станок DLZ-315	95404	1 320,00
2	Токарно-винторезный станок 1ИС611В	95410	5 400,00
3	Токарно-винторезный станок 1ИС611В	95411	4 200,00
4	Универсально-фрезерный станок 6Р82	95419	4 320,00
5	Станок универсально-фрезерный УФ 250-02	95426	8 760,00
6	Вертикально-сверлильный станок МН-18	95030	1 920,00
7	Универсально-фрезерный станок 676П	95428	4 080,00
8	Гравировально-фрезерный станок 6Л463	95433	1 440,00
9	Координатно-расточный станок 2421	95437	3 240,00
10	Токарно-винторезный станок 16Б16КПФ10	95441	3 840,00
11	Станок КФПЭ-250	97942	6 120,00
12	Плоскошлифовальный станок 3Е711В	95448	6 360,00
13	Универсально-фрезерный станок 67К25ПФ2-0	95757	7 320,00
14	Станок точильно-шлифовальный двусторонний 3Л631	95032	1 128,00
15	Универсально-заточной станок 3М642	95458	3 120,00
16	Круглопильный станок ДЦ-334	95460	1 200,00
17	Токарный станок MN80A	95563	2 280,00
18	Универсально-фрезерный станок 67К25ПФ2-01	98187	7 320,00
19	Универсально-фрезерный станок	98186	7 320,00
20	Шлифовальный универсально-фрезерный станок 67К25ПФ2-0	95549	7 320,00
21	Координатно-расточный станок 24К40СФ4	95555	12 120,00
22	Универсально-фрезерный станок GE80ШФ2	95557	8 400,00
23	Ножовочный станок КМ.922-01	95788	1 800,00
24	Ножницы угловые	95622	1 800,00
25	Полировальный шлифовальный станок 3В852	95566	10 440,00

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минску), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 10 (десять) процентов от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 22.11.2021. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема документов: заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по 18.11.2021 до 17.00

Контактные данные	**Тел.:+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объекта недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 10 %):

№ лота	Характеристика имущества	Местонахождение имущества	Начальная цена
1	Капитальное строение (назначение/наименование: здание специализированное финансового назначения) с инвентарным номером 222/С-13593, общей площадью: 323,2 кв. м. (составные части и принадлежности: мансарда, две пристройки, асфальтобетонное покрытие, плиточное покрытие тротуара, площадка для мусора, дымовая труба, сеть электроснабжения, сеть газоснабжения, сеть водопровода, сеть канализации)	Витебская обл., г. Поставы, ул. 17 Сентября, 96В	166 560,00 руб., в т. ч. НДС по ставке 20 % – 27 760,00 руб.

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».
Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 106, кабинет 0.1 в срок до 16.00 03.11.2021.
Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 03.11.2021 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.
Аукцион состоится 05.11.2021 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 106, первый этаж, актовый зал.
Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ. Победитель аукциона либо единственный участник дополнительно возмещает расходы по оценке имущества в размере 657,36 руб. с НДС.
Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретает объекты основных средств по стоимости 1 208,47 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %): каскадная система КС-2-32, приточная установка вентсистем SPS, теплосчетчик ТЭМ-102-2, кондиционер TADIRAN GTM24H.
Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем либо единственным участником не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.
Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8(029) 309-42-19.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Витко-Агро» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **административного здания** *(составные части и принадлежности: сарай, уборная)*, **инв. № 640/С-26970 общей площадью 181,4 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006031 площадью 0,1002 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Козинцева-Прокопчика, 1.**
Начальная цена с НДС (20 %) **– 58 950,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **5 895,00** бел. руб.). *Начальная цена снижена на 58,8 %.*
Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 03.04.2021, 15.06.2021, 11.09.2021.
Аукцион состоится **02.11.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.11.2021** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра 8 (033) 668 83 17.**

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона

Лот: капитальное строение с инвентарным номером 122/С-14549 (наименование: общежитие; назначение: здание общежития), площадью 95,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Гойшика, д. 33, на земельном участке с кадастровым номером 123450100001003706 площадью 0,1909 га (доля в праве аренды – 37/100), составные части и принадлежности: две холодные пристройки

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	11 146,54	Размер задатка, руб.	1 114,65

Продавец: ОАО «Ивацевичдрев», УНП 100325912, т/ф 80164535634. Организатор торгов: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Р/сч для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 5 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. Условия оплаты: согласно заключенному договору купли-продажи. Условия продажи: без условий. Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона компенсирует расходы на проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. Шаг аукциона: 15 % от предыдущей названной цены

Аукцион состоится 9 ноября 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 8 ноября 2021 г. до 17.00

Банк РРБ на твоей скорости

Закрытое акционерное общество «Банк роста и развития бизнеса»
220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18
www.rrb.by

Форма 1

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 октября 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.10.2021	01.01.2021
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	28 223	21 622
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	45 910	42 055
5	Средства в банках	1104	9 014	28 935
6	Ценные бумаги	1105	37 265	39 338
7	Кредиты клиентам	1106	255 840	259 573
8	Производные финансовые активы	1107	20	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	25 201	25 514
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	-	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	2 762	187
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	1
14	Прочие активы	1113	3 893	4 477
15	ИТОГО активы	11	408 128	421 702
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	8 037	15 993
19	Средства клиентов	1203	343 698	340 414
20	Ценные бумаги банка	1204	3 110	13 610
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	2 106	2 527
24	ВСЕГО обязательства	120	356 951	372 544
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	20 429	20 429
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	8 990	8 758
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	9 444	9 452
30	Накопленная прибыль	1215	12 314	10 519
31	ВСЕГО собственный капитал	121	51 177	49 158
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	408 128	421 702

Форма 2

ОТЧЕТ о прибылях и убытках
на 1 октября 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.10.2021	01.10.2020
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	23 451	16 687
2	Процентные расходы	2012	19 577	11 305
3	Чистые процентные доходы	201	3 874	5 382
4	Комиссионные доходы	2021	10 270	5 610
5	Комиссионные расходы	2022	1 865	1 134
6	Чистые комиссионные доходы	202	8 405	4 476
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(246)	(130)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	6 303	4 369
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	20	312
11	Чистые отчисления в резервы	207	8 121	2 377
12	Прочие доходы	208	8 170	1 088
13	Операционные расходы	209	14 894	10 467
14	Прочие расходы	210	893	511
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	2 618	2 142
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	599	351
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	2 019	1 791

И.о. Председателя Правления, Заместитель Председателя Правления Д.В. Клименков

Главный бухгалтер Н.Н. Мостыко

Дата подписания: 14 октября 2021 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 21 выдана 22 июня 2020 года Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100361187.

Разбураючы бар'еры

ЭКСКЛЮЗІЎНА? ІНКЛЮЗІЎНА!

Чаму грамадства павінна адаптавацца да патрэб і асаблівасцяў кожнага чалавека

Аксана КІРЫЛЮК — эканаміст-міжнароднік па адукацыі, папулярызатар сучаснай навукі, выкладчыца аўтарскага курса і майстар-класа па ландшафтным дызайне, заснавальніца студыі бальных танцаў, займаецца аховай жывёл, прасоўваннем жаночых ініцыятыў, засвоіла прафесію зваршчыка, а яшчэ яна адзіная ў Беларусі жанчына — каваль ручнога кавання. Аляксандр СЕВЯРЫН — выкладчык камп'ютарных навук у Мінскім дзяржаўным каледжы электронікі. Вячаслаў ГРЫНЮК — саўладальнік транспартнай кампаніі, якая з'яўляецца афіцыйным партнёрам «Яндэкс-таксі», мае ў падпарадкаванні каля 100 кіроўцаў з адсутнасцю слыху (сярод іх чатыры дзяўчыны). Студэнт чацвёртага курса з Нігерыі Цімаці КУМАЁН, родная мова — англійская, атрымлівае вышэйшую адукацыю ў нашай краіне і засвойвае беларускія традыцыі. Што аб'ядноўвае ўсіх гэтых людзей? «Эксклюзіўна? Інклюзіўна!» — менавіта так была сфармулявана тэма дыскусіі, якая прайшла ў рамках другога Тыдня прафесійнай адукацыі. Як падкрэсліваюць яе арганізатары, гэта была спроба навучыцца казаць пра важнае, бо інклюзія — паняцце вельмі шырокае. Усе мерапрыемствы тыдня прайшлі ў рамках праекта «Занятасць, прафесійная адукацыя і навучанне ў Беларусі», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізоўваецца ў партнёрстве з міністэрствамі адукацыі, працы і сацыяльнай абароны і Рэспубліканскім інстытутам прафесійнай адукацыі.

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ РАБОТА ДЛЯ НЕВІДУШЧЫХ

Доўгі час у нашым грамадстве лічылася, што інваліднасць — гэта пэўная абдзеленасць лёсам. Але жыццё не стаіць на месцы: паступова грамадскія ўстаноўкі, хоць і марудна, але ўсё ж такі змяняюцца. Цяпер у развітых краінах інваліднасць разглядаюць хутчэй як пэўны лад жыцця пры пэўных абставінах, што склаліся ў чалавека. Вось такое карэктнае і нейтральнае азначэнне — без упору на шкадаванне, без паблажлівага стаўлення і погляду зверху ўніз — хутчэй разуменнем абставін, у якіх апынуўся чалавек і да якіх ён павінен прыстасавацца.

Аляксандр Севярын — сам невідушчы, цалкам страціў зрок у 20-гадовым узросце, але ён вучыць праграмаванню падлеткаў з аслабленым зрокам. На базе Мінскага дзяржаўнага каледжа электронікі ў 2006 годзе быў створаны Цэнтр прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Калі раней падлеткі з інваліднасцю маглі разлічваць толькі на авалоданне прафесіяй майстра па рамонце абутку ці швачкі, то цяпер маюць магчымасць атрымаць высокаінтэлектуальную спецыяльнасць. У цэнтры рыхтуюць тэхнікаў-праграмістаў, аператараў ЭВМ, спецыялістаў па камп'ютарнай графіцы, вымяральнікаў электрафізічных параметраў вырабаў электроннай тэхнікі, спецыялістаў па мікра- і нанатэхналогіях. Ёсць і іншыя прафесіі: токар, слесар-зборшчык бытавой тэхнікі, слесар механазборачных работ. Падрыхтоўка ідзе на двух узроўнях: можна атрымаць прафесійна-тэхнічную і сярэднюю спецыяльную адукацыю.

Групы для асаблівых навучэнцаў — малаколькасныя, па 8-10 чалавек. Зроблена гэта для таго, каб была магчымасць індывідуальнага падыходу да кожнага падлетка. Тут займаюцца хлопцы і дзяўчаты з парушэннямі апорна-рухальнага апарату, зроку і слыху, з расстройствамі аўтыстычнага спектру.

— Невідушчыя не любяць слова «сляпы», — канстатуе Аляксандр Севярын. — У нас нават арганізацыя, якая аб'ядноўвае невідушчых людзей, называется Беларускім таварыствам інвалідаў па зроку, а не таварыствам сляпых, як у Расіі. Але інвалідам я сябе таксама не адчуваю. Больш правільна было б казаць, напэўна, пра сацыяльную інваліднасць, а не пра медыцынскую. Насамрэч у невідушчых людзей не так шмат магчымасцяў для атрымання прафесіі і будучага працаўладкавання. І гэта, хутчэй, інтэлектуальная, а не фізічная праца: невідушчыя могуць аказваць юрыдычныя паслугі, псіхалагічную дапамогу, быць музыкантамі, працаваць у дыспетчарскіх службах на тэлефоне. Пры навучанні слабавідушчых рабоце на камп'ютары мы выкарыстоўваем адмысловыя дысплэі, якія дазваляюць выводзіць інфармацыю з экрана камп'ютара ў выглядзе тэксту шрыфтам Брайля. Але невідушчыя могуць працаваць і без гэтага дысплэя, толькі за кошт спецыяльнага праграмнага забеспячэння — для работы ім хапае звычайнай клавіятуры, сістэмнага блока, навушнікаў і гукавой карты.

У перапоўненым грамадскім транспарце часта можна пачуць: «Ты што, глухі?» А чалавек, да якога звяртаюцца, насамрэч не чуе. Можна проста асцярожна дакрануцца рукой, каб прыцягнуць яго ўвагу.

«Калі вы бачыце чалавека з белым кіем, не кідайцеся яму дапамагаць, не пацікавіўшыся, а ці патрэбная яму ваша дапамога. Не варта думаць, што ён цалкам бездапаможны. Тым больш не вырывайце ў яго з рукі кій. Я гатовы застацца на вуліцы без адзення, а вось застацца без кія — ні ў якім разе, — папярэджвае Аляксандр Севярын. — Да таго ж вы не ведаеце, якую рэакцыю можаце атрымаць у адказ. Правільна будзе падысці, павітацца і запытацца, ці патрабуецца ваша дапамога. Хоць я і невідушчы, але вашы спачуванні мне непатрэбныя. І я ніколі не буду працаваць і адмоўлюся ад любой прапановы, калі буду адчуваць, што гэта робіцца з-за таго, што мяне шкадуюць...»

НА МОВЕ ЖЭСТАЎ

Вячаслаў Грынюк — інвалід па слыху. Калі з'явілася Uber-таксі, ён працаўладкаваўся туды кіроўцам. Потым у кампанію прыходзілі такія ж, яе ён, хлопцы, і Вячаслаў фактычна працаваў пасрэднікам паміж імі і адміністрацыяй. Тлумачыў іх службовыя абавязацельствы, як кантактаваць з кліентамі, нюансы будучай работы. А затым у яго ўзнікла ідэя адкрыць свой бізнес і дапамагаць хлопцам са стратай слыху. Пасажыры, якія карыстаюцца «Яндэкс.Таксі», напэўна, сутыкаліся ў паездках з маўклівымі кіроўцамі, але з'яўленне сучасных гаджэтаў вельмі спрашчае камунікацыю. Вячаслаў прыгадаў выпадак, калі таксі выклікала сямейная пара. Да кліентаў накіравалі машыну з глухім кіроўцам. Тыя папрасілі павялічыць хуткасць, бо ў жанчыны пачаліся родавыя схваткі. На пытанне, а чаму вы не выклікалі хуткую дапамогу, адказ быў: «Вы прыехалі б хутчэй». Будучая маці трапіла ў радзільню за лічаныя хвіліны да родаў...

Сёння кіроўцы з адсутнасцю слыху і маўлення займаюцца ў кампаніі Вячаслава таксама грузаперавозкамі — і ніводнай скаргі ці заўвагі за год на іх работу не паступіла. У далейшых планах — арганізаваць яшчэ і кур'ерскую службу.

Людміла СТОМА — перакладык з мовы жэстаў у тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Фрунзенскага раёна сталіцы. Яна кажа, што ў ЗША мова жэстаў — трэцяя па папулярнасці сярод тых, што вывучаюцца. І там значна прасцей пры звароце ў тую ці іншую арганізацыю сустрэць спецыяліста, які зразумее чалавека без слыху. На яе думку, было б карысна і ў нашых школах вывучаць хоць бы «азы» жэставай мовы, што дазволіла б разбурыць існуючыя бар'еры. Некалькі гадоў таму была створана экстранная служба сурдаперакладу, дзе кантактаванне адбываецца ў відэачаце. Пры звароце грамадзяніна сурдаперакладчык, выступаючы ў ролі дыспетчара, перадае паведамленне ў экстранныя службы і інфармуе таго, хто звярнуўся, што яго заяўка прынятая і праз які час будзе аказана неабходная дапамога.

Вячаслаў Грынюк канстатуе, што не заўсёды людзі паводзяць сябе карэктна ў адносінах да людзей з адсутнасцю слыху. У перапоўненым грамадскім транспарце часта можна пачуць: «Ты што, глухі?» А чалавек, да якога звяртаюцца, насамрэч не чуе. Можна проста асцярожна дакрануцца рукой, каб прыцягнуць яго ўвагу. А пры іншых абставінах да людзей, якія не чуюць, лепш звяртацца, гледзячы ім у твар, а вось фізічны кантакт непажаданы. Гэта ўсё асновы інклюзіўнага этыкету, якому нідзе ў нас не вучаць.

НАСУПЕРАК СТЭРЭАТЫПАМ

Увогуле, дакладнае разуменне таго, што кожны чалавек мае права і можа быць уключаны ў нармальнае жыццё, — адзін з самых галоўных пастулатаў інклюзіі ў адукацыі. Але інклюзія — працэс, які закранае не толькі сферу адукацыі. Ён закліканы разбураць бар'еры ў свядомасці грамадства, рабіць яго больш талерантным, гуманным і адкрытым да разнастайнасці наогул...

Напрыклад, студэнт з Нігерыі Цімаці Кумаён прызнаўся, што прыкладна два гады не мог адаптавацца ў нашым грамадстве без ведання мовы. Клімат — іншы, ежа — нязвыклая. Ніхто яго не разумеў. Дакладна так, як не разумеюць глуханямых і мову жэстаў. Праблематычна хутка адаптавацца на новым рабочым месцы любому іншаземцу, нават пры адсутнасці праблем з маўленнем, і ім таксама патрабуецца інклюзія.

Аксана Кірылюк сёння займаецца любімай справай — ручным каваннем. Яна ўпэўненая, што не бывае жаночых і мужчынскіх прафесій, і некалькі гадоў таму арганізавала фотавыстаўку «Яе справа» — пра беларусак, якія знайшлі сябе ў рэдкіх прафесіях: падземны рабочы, ляснічы, электраманцёр, зваршчык, кіроўца-выпрабавальнік, мехатронік і іншых. Іх выбіраюць нямногія з жанчын — і застаюцца ў іх нямногія. Беларускі палічылі іх цікавымі і перспектыўнымі, зыходзячы з уласных перакананняў, незалежна ад меркавання акружэння і стэрэатыпаў у грамадстве.

— Людзі, якія займаюцца чымсьці нязвыклым для навакольных, адчуваюць дыскамфорт ад таго, як іх успрымаюць, — кажа Аксана. — А калі спрабуеш давесці ім сваю пазіцыю, неразуменне ўзрастае ў геаметрычнай прагрэсіі. Мне прасцей казаць, што я мастак па метале, чым тое, што я каваль. На жаль, але рэакцыя грамадства на тых людзей, якія выйшлі па-за ўстаноўленыя рамкі, спыняе менш рашучых. Не бывае жаночых і мужчынскіх прафесій — гэты падзел існуе толькі ў нашай галаве.

НОВЫ СВЕТАПОГЛЯД

Інклюзію часта параўноўваюць з культурнай разнастайнасцю. І гэта не дзіўна, бо ў сучасным свеце пад ёй разумеюць усё, што дазваляе акунуцца ў асяроддзе магчымасцяў і пашырыць свой вопыт.

А прыстасоўвацца да рэалій і ўмоў навакольнага свету і грамадства павінен не толькі чалавек з інваліднасцю — грамадства таксама павінна адаптавацца і прыстасоўвацца да патрэб і асаблівасцяў кожнага чалавека, з інваліднасцю ці без яе. Усё гэта называецца інклюзіяй — працэсам рэальнага ўключэння ўсіх людзей, у тым ліку і з інваліднасцю, у актыўнае грамадскае жыццё. Але работа па фарміраванні талерантнасці, інклюзіўнай культуры з'яўляецца, мабыць, адной з найбольш складаных задач.

Пакуль, на жаль, у нас у адносінах да інваліднасці і інвалідаў пераважае медыцынскі падыход, а патрабуецца — сацыяльны. І каму, як не педагогам, быць першымі ў выкараненні стэрэатыпаў? Інклюзіўная адукацыя — гэта найперш новы светапогляд, сістэма іншых адносін, дзе прыярытэтам з'яўляюцца не акадэмічныя поспехі, а фарміраванне здольнасці жыць у грамадстве, дзе прызнаецца і паважаецца разнастайнасць, цэніцца ўнікальнасць кожнага чалавека.

Ад інклюзіі ў адукацыі выйграюць і звычайныя дзеці. У іх развіваецца безбар'ернае мысленне. Інклюзіўнае асяроддзе вучыць знаходзіць моцныя бакі ў кожным і не прычэпліваць ярлыкі. Інклюзіўны вопыт дапаможа дзіцяці ў будучыні, калі яно будзе кантактаваць з кімсьці адрозным ад яго. Сустракаючы чалавека на вазку на вуліцы, ён ужо не будзе адводзіць вочы, пужацца, шкадаваць. Інклюзія — гэта не гісторыя пра шкадаванне...

Ёсць пытанні і па медыцынскім допуску да атрымання адукацыі па той ці іншай спецыяльнасці. З аднаго боку, з прычыны абмежаваных фізічных магчымасцяў патэнцыяльнага абітурыента для медыка відавочная небяспека авалодання ім тымі ці іншымі прафесійнымі кампетэнцыямі. Але, з іншага боку, можа, мае сэнс разглядаць атрыманне прафесійнай адукацыі як самастойную каштоўнасць, без прывязкі да магчымасці работы па атрыманай спецыяльнасці. Проста як адзін з важных этапаў жыцця людзей з асаблівымі патрэбамі?

— Асабіста я лічу, што беларускае грамадства не моцна прасунулася ў пытаннях інклюзіі. Мы любое адрозненне ўспрымаем як падставу выгнаць чалавека з грамадства, — падзяліўся сваім меркаваннем Аляксандр Севярын.

Таццяна ЖУК, дырэктар Брэсцкага абласнога цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, расказала, што праводзіла анкетаванне больш як 500 чалавек. На пытанне «Што вы адчуваеце і ці адчуваеце бар'ер, калі бачыце чалавека з цяжкай формай інваліднасці?», 90 працэнтаў прызналіся, што іх ахопліваюць страх, шкадаванне, душэўны боль. «Гэта адмоўныя эмоцыі, перашкода ва ўспрыманні чалавека, які непадобны на цябе, — канстатуе спецыяліст. — Таму нам трэба шмат працаваць у напрамку сацыяльнай інклюзіі...»

Хтосьці вельмі трапна параўнаў інклюзію з вялікім сімфанічным аркестрам, дзе мы ўсе разам рэпеціруем і спрабуем стварыць музыкальны шэдэўр. Сэнс не ў тым, каб усе рабілі ўсё аднолькава, а ў тым, каб магчымасці кожнага разумелі і прымалі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Я ПРЫШЧЭПКІ НЕ БАЮСЯ?

З цукровым дыябетам, анкалогіяй, імунасупрэсіяй вакцынавацца трэба ў першую чаргу

Міністэрства аховы здароўя падрыхтавала серыю відэаролікаў «Ковід у пытаннях і адказах», прысвечаных пытанням вакцынацыі. Яны зроблены ў рамках праекта Сусветнага банка «Экстраннае рэагаванне на COVID-19 у Рэспубліцы Беларусь». Адказы на папулярныя пытанні далі эксперты — урачы-практыкі, вучоныя, выкладчыкі медыцынскіх ВНУ. Прыводзім некаторыя з іх.

— Ці можна прышчапляцца людзям з цукровым дыябетам?

Таццяна МОХАРТ, доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык кафедры эндакрыналогіі БДМУ:

— Не можна, а трэба. Цукровы дыябет адносіцца да захворванняў, якія істотна павышаюць рызыку негатыўных наступстваў пры захворванні COVID-19. Сёння даказана, што пры цукровым дыябеце часцей узнікае неабходнасць шпіталізацыі ў аддзяленне інтэнсіўнай тэрапіі, штучнай вентыляцыі лёгкіх — і, выдома, больш лятальных канцоў. Для таго каб мінімізаваць гэтыя рызыкі, пацыенты з цукровым дыябетам у многіх краінах адносяцца да катэгорыі асоб, якім вакцынацыя рэкамендуецца ў першую чаргу.

— Ці трэба вакцынавацца тым, у каго зніжаны імунітэт? У прыватнасці, людзям, у якіх аслаблены імунітэт з-за пэўнай хваробы ці прыёму лекаў — пасля трансплантацыі органаў, ВІЧ-інфікаваным, пацыентам з анкалагічнымі хваробамі?

Ігар СТОМА, урач-інфекцыяніст, рэктар Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, дацэнт:

— Магу з поўнай адказнасцю заявіць, што гэтыя пацыенты ў першую чаргу павінны быць прышчэпленыя ад COVID-19, бо менавіта яны рызыкуюць перанесці інфекцыю ў найбольш цяжкай форме. Першыя даныя, якія паступілі з Італіі, сведчаць, што кожны пяты пацыент, які загінуў ад каранавіруса ў першую хвалю ў Італіі, меў анказахворванне ў той ці іншай форме. А гэта вялікая катэгорыя людзей, якія маглі б жыць, бо, магчыма, іх анказахворванне магло быць выведзена ў стадыю рэмісіі. Так што па выніках даследаванняў, якія маюцца ў свеце, пацыенты з анказахворваннямі, гематалагічнымі захворваннямі, пасля трансплантацыі органаў і тканак з'яўляюцца важнай групай для вакцынацыі.

Зразумела, рашэнне аб тэрмінах вакцынацыі павінна прымацца на кансіліуме пры ўдзеле профільных спецыялістаў, які вядуць дадзенага пацыента. Гэта не самастойнае рашэнне, яно павінна быць абгрунтавана спецыялістамі адпаведнага профілю.

— Ці прышчапляцца тым, хто перахварэў? Кажуць, што ў тых, хто прышчапіўся, былі сур'ёзныя наступствы...

Наталля МІЦЬКОЎСКАЯ, тэрапеўт, кардыёлаг, загадчык кафедры кардыялогіі і ўнутраных хвароб БДМУ, дырэктар РНПЦ «Кардыялогія», доктар медыцынскіх навук:

— Я мела магчымасць «пазнаёміцца» з гэтай інфекцыяй, і ўспаміны ў мяне засталіся самыя непрыемныя. Больш за ўсё хачу ў будучым ніколі гэтага не паўтарыць. У мяне ў прынцыпе не было сумненняў, ці патрэбная мне вакцынацыя. Я прышчапілася ў максімальна ранніяя тэрміны пасля перанесенай каранавіруснай інфекцыі — літаральна праз тры месяцы.

Многія людзі цікавяцца меркаваннем самых розных спецыялістаў, што павінна быць крытэрыем вакцынацыі ў чалавека, які перанёс каранавірусную інфекцыю. Адзінага пункту гледжання ў свеце з гэтай нагоды няма. Больш за тое, часам дастаткова катэгарычна вельмі аўтарытэтныя спецыялісты заяўляюць, што і ўзровень антыцелаў не мае значэння ў гэтай сітуацыі. Тым не менш, пасля хваробы я прыкантралявала ўзровень антыцел у сябе і запэўнілася, што ён дастаткова нізкі, пасля таго вакцынавалася «Спадарожнікам V». Чаму менавіта гэтай вакцынай? Асаблівага перакананне, што ў маёй сітуацыі патрэбная менавіта гэтая вакцына ці нейкая іншая, не было, але на той момант, калі я выконвала вакцынацыю, было дастатковка шмат навуковых даных аб яе эфектыўнасці.

Ці былі ў мяне пабочныя эфекты? Так, былі. І асабіста я лічу, што гэта сведчыць пра тое, што вакцына спрацавала, і спрацавала фантастычна, бо ў мяне быў вельмі высокі ўзровень антыцел — большы за 27 тысяч, гэта сапраўды сур'ёзная лічба. І цяпер я дастаткова актыўна працую, у тым ліку і з пацыентамі, выконваючы масачны рэжым, рэгулярна праветрываючы кабінет. Я адчуваю пэўную ступень абаронанасці, і лепш яшчэ калі-небудзь перажыву пабочныя эфекты ад вакцынацыі, чым яшчэ раз сутыкнуся з самой каранавіруснай інфекцыяй. Гэта рэчы абсалютна несупастаўляльныя. І мы павінны разумець, што верагоднасць з'яўлення значных пабочных эфектаў надзвычай малая, а імавернасць цяжкага цячэння каранавіруснай інфекцыі, на жаль, вялікая. І нагадваю пра постковідны сіндром, які, на жаль, свой страшны твар цалкам яшчэ не паказаў. Мы пакуль не ведаем, што такое аддаленыя наступствы перанесенай каранавіруснай інфекцыі.

— Ці праўда, што вакцынацыя — моцны ўдар па імуннай сістэме?

Ігар СТОМА, урач-інфекцыяніст, рэктар Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, дацэнт:

— Для пачатку хацеў бы сказаць, што гэта прынцыпова няправільны механістычны погляд. Імунная сістэма — гэта не шалі, на якія вы нагружаеце кілаграмы і такім чынам уплываеце. Гэта дастаткова збалансаваная сістэма, якая мае патрэбу ў знешніх сігналах. Калі яна не атрымлівае ўздзеяння звонку ў выглядзе кантакту з мікробамі, антыгенамі, то яна страчвае якасць сваёй работы. Гэта як чалавек, які не займаецца фізічнымі практыкаваннямі, — яго мышцы будуць змяншацца ў аб'ёмах і якасці. Так і імунная сістэма: калі вы яе не трэніруеце, зніжаеце якасць сваёй работы. Таму абсалютна няправільна механістычна разглядаць, што нейкі імунабіялагічны прэпарат аказвае ўплыў. Гэта не нагрузка, а натуральнае ўздзеянне, якое неабходнае для каліброўкі імуннай сістэмы. Штодзень наша імунная сістэма рэагуе на дзясяткі тысяч антыгенаў, якія мы атрымліваем з ежай: мяса, морапрадукты — гэта антыгены, імунная сістэма кішэчніка рэагуе на іх, і нічога страшнага ў гэтым няма — наадварот, з'яўляецца нормай. Таму трэніраваць імунную сістэму з дапамогай вакцын натуральна і нармальна.

— Я перахварэў на COVID-19, калі мне вакцынавацца?

Іна ФЁДАРАВА, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры эпідэміялогіі БДМУ:

— Вакцынацыя тым, хто перахварэў на COVID-19, рэкамендаваная незалежна ад ступені цяжару хваробы — у лёгкай, сярэдняй ці цяжкай форме яна была. Падчас вакцынацыі чалавек павінен быць здаровы, а для гэтага патрэбны час ад 2 да 8 тыдняў пасля папраўкі. І пра працягу гэтага часу трэба вырашаць пытанне з вакцынацыяй.

— Ці ёсць у рэанімацыі тыя, хто прышчапляўся?

Юрый ГОРБІЧ, загадчык кафедрай інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый БелМАПА, дацэнт, кандыдат медыцынскіх навук:

— Не буду крывіць душой, яны сапраўды ёсць, але іх вельмі мала. Калі браць тую ж расійскую статыстыку, то там у цяжкім стане ад 0,05 % да 1 % прышчэпленых. Гэтая лічба адрозніваецца па рэгіёнах, працэнт вышэйшы там, дзе менш прышчэпленых. Рэальна ніводная вакцына не валодае 100 % эфектыўнасцю. І калі мы гаворым пра «Спадарожнік V» ці кітайскую вакцыну Vero Cell, эфектыўнасць у іх высокая, у першай дасягае 92 %. Гэта значыць, што са 100 прышчэпленых чалавек 92 атрымаюць імунітэт, а восем — не, і застануцца ўспрымальныя да віруса. Таму ў рэанімацыі ёсць прышчэпленыя, бо гэтыя восем нікуды не дзенуцца, а калі яны маюць фактары рызыкі, то ў іх развіваецца цяжкі стан. Маленькае «але» ў тым, што калі вы мяне спытаеце, ці шмат у рэанімацыі прышчэпленых, то я адкажу, што адзінкі.

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ — СПАДЧЫННЫ ФАКТАР

Хто рызыкуе захварэць на рак малочнай залозы?

Кастрычнік — Сусветны месяц барацьбы з ракам малочнай залозы. Яго абвясцілі ў 1993 годзе, мяркуючы, што гэта павысіць дасведчанасць пра захворванне і прыцягне да яго ўвагу жанчын. Паводле ацэнак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, рак малочнай залозы — галоўная прычына смерці жанчын ад анкалагічных захворванняў. Летась у свеце ад гэтай паталогіі памерлі 685 тысяч жанчын, было зарэгістравана звыш 2,3 мільёна выпадкаў. Урачы не стамляюцца паўтараць пра неабходнасць прафілактычнага абследавання, бо на ранняй стадыі рак грудзей паспяхова лечыцца. Але з-за пандэміі каранавіруса колькасць абследаванняў скарацілася — многія пацыенткі баяцца заразіцца ў клініцы. Пры гэтым у Беларусі рак малочнай залозы знаходзіцца на першым месцы ў структуры анкапаталогій у жанчын. Урачы Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава нагадалі пра важныя правілы ў жыцці кожнай з нас.

— Анкалагічная захваральнасць — сур'ёзная праблема не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце. Смяротнасць ад анкалогіі займае другое месца пасля хвароб органаў сістэмы кровазвароту, — кажа **намеснік дырэктара па медыцынскай частцы РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя**

М. М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар Наталля ЯФІМЕНКА. — Што датычыцца раку малочнай залозы, ва ўсім свеце выяўляецца штогод не менш за мільён новых выпадкаў. Раней лічылася, што хварэюць у асноўным жанчыны пажылога ўзросту, прынамсі, пасля 50 гадоў, аднак цяпер пухліны знаходзяць і ў больш маладым узросце. Рак малочнай залозы — не выключна жаночая праблема, але мужчыны хварэюць на яго ў сто разоў радзей.

Сярод асноўных фактараў рызыкі ўрач называе спадчынны фактар, перадракавыя захворванні, стрэсы, гарманальны дысбаланс і іншыя.

— На першае месца я б паставіла спадчынны фактар, — адзначае Наталля Яфіменка. —Тры формы — гэта рак малочнай залозы, яечніка і коларэктальны — складаюць каля 90 % спадчынных анкалагічных хвароб. У цэлым жа спадчынная форма займае ўсяго каля аднаго працэнта ад усёй папуляцыі, і ў Беларусі каля 100 тысяч пацыентаў схільныя да спадчынных формаў захворвання на рак. Яны ведаюць, што з'яўляюцца носьбітамі пэўных мутацый. Нельга казаць, што гэтыя пацыенты абавязкова захварэюць, але рызыка ў іх павышаная ў дзясяткі і сотні разоў у параўнанні з людзьмі, якія не маюць такіх генных мутацый.

Яшчэ адзін фактар — перадпухлінныя перадракавыя захворванні, а таксама траўмы малочнай залозы.

— Мастапатыі, фібраадэномы, кісты — гэта фактары рызыкі. Таксама гарманальны дысбаланс, стрэсы, хваробы органаў малога таза, печані, бо рак малочнай залозы з'яўляецца гармоназалежным захворваннем, а асноўная частка гармонаў утылізуецца менавіта ў ёй, — удакладняе суразмоўніца.

У анкалогіі некалькі відаў прафілактыкі: пярвічная, другасная і трацічная. Пярвічная накіравана на папярэджанне захваральнасці і тое, каб своечасова выяўляць паталогію. Тут важная роля скрынінгавых мерапрыемстваў. Сістэма скрынінгу арганізавана ва ўсіх рэгіёнах краіны. Гэта мамаграфічнае даследаванне, якое жанчына ва ўзросце з 50 да 70 гадоў праходзіць незалежна ад наяўнасці сімптомаў раз на два гады. Калі выяўляецца захворванне, то на ранняй стадыі, і ў гэтым перавага скрынінгу.

Другасная прафілактыка — гэта перш за ўсё зніжэнне смяротнасці. Тут найперш увага аддаецца лячэнню розных паталогій прадраку, напрыклад, такіх, як фібраадэномы. Такім чынам ствараюцца ўмовы, каб яны не пераходзілі ў злаякасныя новаўтварэнні. Трацічная прафілактыка — папярэджанне рэцыдываў метастазаў. Калі пацыентка мае рак малочнай залозы, то задача анколагаў — не дапусціць прагрэсіравання хваробы, каб як мага менш утваралася метастатычных формаў і рэцыдываў.

— Ранняя дыягностыка — гэта не толькі скрынінгавыя даследаванні, але і выяўленні мутацый у генах BRCA1 і BRCA2. Пацыенты па жаданні могуць звярнуцца ў нашу малекулярную лабараторыю канцэрагенезу, якая займаецца іх выяўленнем. Калі ёсць мутацыі, спецыялісты даюць рэкамендацыі, як дзейнічаць далей, — расказала Наталля Яфіменка.

Паводле слоў **загадчыка лабараторыі рэканструкцыйна-аднаўленчай хірургіі і анкамамалогіі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, кандыдата медыцынскіх навук, дацэнта Антона ХОРАВА,** анкаслужба Беларусі валодае ўсімі магчымасцямі, якія адпавядаюць агульнасусветнаму ўзроўню. Выкарыстоўваюцца УГД, МРТ, КТ-дыягностыка, малекулярна-генетычныя і патамарфалагічныя даследаванні. На базе РНПЦ працуе Рэспубліканскі цэнтр пазітронна-эмісійнай тамаграфіі.

— Ёсць пастулат, што пакуль не будзе поўнага абследавання, лячэнне пачынаць немэтазгодна. Толькі сабраўшы ўсю інфармацыю, можна распрацаваць план лячэння. Гэта дае добры вынік, — адзначае Антон Хораў.

Што датычыцца хірургічнага лячэння, то беларускія анколагі валодаюць усімі магчымасцямі стандартных і рэканструкцыйна-пластычных аперацый, што дазваляе адначасова правесці рэабілітацыю.

ТЫСЯЧА І АДНА ДОБРАЯ СПРАВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наш герой прапанаваў сесці ў аўтамабіль і праехаць па мясцінах, дзе летам 1941-га ішлі жорсткія баі. Тут, у раёне Слуцка і Старых Дарог, вайскоўцы 121-й стралковай дывізіі змагаліся з ворагам да апошняга...

ПАМЯЦІ СТРАЛКОЎ

У вайну ў трохвугольніку паблізу вёсак Рубяжы — Вярхуціна — Сінегава стаяў глухі лес. Дарог праз гушчар не было. Гэта цяпер мы перасякаем лес на машыне. Тады ж тэхніка тут была рэдкасцю: бой вялі ў асноўным пехацінцы.

Сілы былі няроўныя. 121-й дывізіі, якая не мела вопыту баёў, супрацьстаяла добра ўзброеная гітлераўская групоўка. Чырвонаармейцы адступалі. Зусім немалая частка дывізіі на чале з яе камандзірам генерал-маёрам Зыкавым адышла ў кірунку Гомеля. Большасць асабовага складу засталася тут, у слуцкіх і старадарожскіх лясах. Вайскоўцы не трацілі надзеі на дапамогу. Аднак яна так і не падаспела...

Як сведчаць гісторыкі, баі тут былі жорсткія. Выйшлі з акружэння або трапілі ў палон да ворага ў найлепшым выпадку паўтары-дзве сотні савецкіх салдат. Цяжка ўявіць, што для астатніх гэтыя прыгожыя сёння мясціны — з мяккім мохам пад нагамі, з маладым хвойнікам і высачэзнымі бярозамі, са смачным водарам апалага лісця і найпрыгажэйшымі спевамі птушак — сталі вялікай брацкай магілай.

Масавай эксгумацыі астанкаў чырвонаармейцаў тут не было да цяперашняга часу. Гэта задача на наступны сезон для 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны. З пошукавай групай імя Каржа, якая складаецца ўсяго з васьмі чалавек, Уладзімір Бойка ўздоўж і ўпоперак абышоў месцы баёў. Пошукавікі ведаюць не толькі канкрэтныя лакацыі, дзе спачываюць загінулыя воіны. Неабыякавыя да гістарычнай памяці людзі знаходзяць і перадаюць у Старадарожскі гісторыка-этнаграфічны музей спадарожныя знаходкі: фрагменты зброі, аскепкі снарадаў, кубкі, флягі, значкі... Акрамя таго, яны ўстанаўліваюць новыя дэталі баёў.

Ідэя ўвекавечыць подзвіг вайскоўцаў дывізіі тут жа — у эпіцэнтры падзей, а цяпер проста ў глыбіні лесу — Уладзіміру Бойку прыйшла, калі паднялі астанкі першага салдата. Наш герой доўга абдумваў, як тое зрабіць. Месца разам з уладамі Старадарожчыны выбраў адразу: на невялікім пералеску каля лясной дарогі, у атачэнні маладога хвойніку. Дзякуючы аднадумцам дастаў з балота валун, пачысціў, устанавіў як помнік, на якім неўзабаве з'явілася і мемарыяльная дошка. Аднак нечага не хапала, і краязнавец паехаў з дырэктарам раённага музея па параду ў Мінск, у Рэспубліканскі мастацкі экспертны савет, якім кіруе Іван Міско. Народны мастак Беларусі прапанаваў Уладзіміру Бойку дапоўніць помнік сімвалічнай скульптурай, зробленай са знаходак на месцы баёў. Так тут з'явілася і кампазіцыя з гільзаў, аскепкаў міны, гарматнага кола, штыка ад вінтоўкі, каскі, дыска з кулямёта — усяго таго, што засталося як напамін аб загінулых салдатах.

— Помнік адкрылі ў дзень 80-годдзя першага бою дывізіі на старадарожскай зямлі: сёлета, 6 жніўня, — расказвае Уладзімір Бойка. — Астанкі мы разам з вайскоўцамі 52-га пошукавага батальёна паднялі, з уладамі раёна перапахавалі, адзначылі гэта ў адпаведных дакументах. Каб засталася памяць, трэба было нешта рабіць.

І ён зрабіў — пра тое сведчыць помнік. Людзі цікавяцца, з якой нагоды апошні пастаўлены. Падышла да манумента і Ала Уладзіміраўна, якая збірала грыбы побач. Уважліва прачытаўшы надпіс, жанчына спытала: «Як прайсці на комплекс?»

ТУРЫСТЫЧНЫ МАРШРУТ

«Комплексам» мясцовыя завуць мемарыял, таксама прысвечаны 121-й стралковай дывізіі. Створаны ён быў даўно, яшчэ за савецкім часам. Але пра яго мала хто ведае, а калі і чуў, то наўрад ці без праваднiка туды дабярэцца. Размясціўся комплекс у лясной глушы: ні вёскі ніякай побач, ні больш-менш нармальнай дарогі. Але дзякуючы Уладзіміру Бойку, які тут ведае кожны квадратны метр, мы туды ўсё ж такі трапілі.

На гэтым месцы падчас вайны знаходзіўся штаб 121-й стралковай дывізіі. Штабны бліндаж (вядома, адноўлены) быццам чакае сваіх гаспадароў, якія не вярнуліся з бою. Напагатове — кулямёт «Максім» (краязнавец зрабіў копію, бо арыгінал укралі), палкавая гармата. Тут і жалобныя скульптуры, і акопы — усё яшчэ раз вымушае задумацца аб трагедыі, якую прынеслі на нашу зямлю акупанты, аб подзвігу савецкіх салдат, якія палажылі тут свае жыцці, каб іншыя пакаленні не ведалі, што такое вайна.

У гэтым заслуга і бацькі Уладзіміра Бойкі. На фронт яго прызвалі ў 1944-м, пасля вызвалення Беларусі. Прайшоў Польшчу, дайшоў да Германіі, у 1946 годзе аднаўляў Сталінград. Да канца жыцця ён успамінаў, што ў горадзе не было ніводнага жывога месца: ні ваяваць, ні, тым больш, жыць там было немагчыма. «Дзед партызаніў, — гаворыць краязнавец. — Апошнім разам прыскакаў на кані дахаты падчас аперацыі «Баграціён». Больш яго ніколі не бачылі. Не ведаем нават, дзе пахаваны...»

Уладзімір Бойка лічыць, што па такіх мясцінах абавязкова трэба праводзіць экскурсіі. Асабліва, на яго погляд, гэта актуальна цяпер, калі пачалі перапісваць гісторыю, калі гераізм савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне аспрэчваецца, а мірных людзей, якія сталі ахвярамі генацыду, увогуле не лічаць за патрэбнае згадваць.

— Каля Мінска ёсць «Лінія Сталіна», а чаму б нам не зрабіць лінію Старадарожчыны, Случчыны? — мяркуе Уладзімір Бойка. — Тут пустуе пяць гектараў зямлі, засталіся акопы. Трэба толькі правільна арганізаваць прастору. Турыстычны маршрут варта прадумаць абавязкова, бо самастойна сюды мала хто паедзе. А пабываць у гэтых мясцінах, асабліва дзецям, неабходна — яны павінны ведаць сваю гісторыю, ганарыцца тымі, дзякуючы каму мы сёння жывём у мірнай і спакойнай краіне.

У РОДНАЙ ВЁСЦЫ

Уладзімір Бойка не толькі рупіцца аб справе захавання гістарычнай памяці, уласным прыкладам паказваючы, што дзеля таго трэба рабіць. Ён не на словах, а на справе любіць сваю родную вёску. У Вясеі, што за некалькі кіламетраў ад Слуцка, нарадзіўся, рос, тут жыве і цяпер. І ні на які горад ніколі не прамяняе на сваю малую радзіму. Тут жыве яго маці, якая неўзабаве адзначыць свой 90-гадовы юбілей, у вёсцы пабудаваўся і сын.

«Вёску трэба захоўваць, бо іначай не будзе будучыні», — перакананы Уладзімір. І гэта, зноў жа, не проста словы. Яго ўласны ўклад у захаванне роднай Вясеі мала назваць важкім. У свой час прадпрымальнік прыклаў намаганні, для таго каб у вёсцы з'явілася дарога: тут жылі ветэраны, а ім, на яго думку, лепш хадзіць па асфальце, чым па пяску. Цяпер, калі хтосьці набывае ў вёсцы хату, Уладзімір бязвыплатна дапамагае з тэхнікай — галоўнае, каб людзі тут заставаліся.

Не абыходзіць увагай і школу, дзе вучыўся. Да яе стагоддзя мужчына паставіў у школьным двары памятны камень, стварыў мемарыяльную шыльду, якую прысвяціў вядомаму выпускніку — Канстанціну Давідоўскаму, што ў складзе атрада касманаўтаў першы ў Савецкім Саюзе кіраваў месяцаходамі. Запрашае ў школу вядомых людзей, цікавых суразмоўнікаў.

МЕЦЭНАТ, КАЛЕКЦЫЯНЕР

